ЦІ РАБІЦЬ ПРЫШЧЭПКУ АД ГРЫПУ? 6

ПІНСК — СТАЛІЦА... БАЛАЛАЕК 7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 КАСТРЫЧНІКА 2018 г. АЎТОРАК № 189 (28805)

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Павел УЦЮПІН, міністр прамысловасці:**

*«Сёлета ў нас растуць аб'ёмы вытворчасці. Калі ў 2016 годзе мы прыраслі на 4,1 %, летась — на 14,1 %, то даныя васьмі месяцаў 2018 года гавораць пра тое, што мы захоўваем гэтую станоўчую дынаміку — прырост таксама на 14 % да аналагічнага перыяду 2017-га. Другі паказчык развіцця — экспарт. Наша галіна экспартна арыентаваная, 70 % прадукцыі мы павінны прадаваць па ўсім свеце. Па экспарце ў нас прырост прыкладна на 20 %. Пры экспарце ў $2,7 млрд па прадпрыемствах Мінпрама станоўчае сальда складае $1,2 млрд. Тыя задачы, якія сёлета перад галіной ставіць Прэзідэнт і ўрад, будуць выкананы».*

## КАРАТКА

**• Мінскі аўтамабільны завод у лістападзе запусціць у Брэсце серыйную вытворчасць мікрааўтобусаў і фургонаў.**

• Уладзімір Макей на 73-й сесіі Генеральнай асамблеі ААН у Нью-Ёрку прадставіў пазіцыю Беларусі па рэфармаванні арганізацыі.

**• Беларусь адправіла афіцыйную заяўку на вылучэнне фільма «Хрусталь» рэжысёра Дар'і Жук на саісканне кінапрэміі «Оскар».**

• Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл прыбудзе ў Беларусь 13 кастрычніка.

**• У Беларусі забаранілі плаціць гандлю ўзнагароджанні за прасоўванне алкаголю.**

• Вучэнне разведчыкаў АДКБ «Пошук 2018» пачалося ў Казахстане.

ISSN 1990 - 763X

# ВОСЕНЬСКАЯ ПЕРАЗАГРУЗКА

***Аптымісты і жыццялюбы (а мы проста перакананыя, што сярод чытачоў «Звязды» такіх людзей большасць) лічаць, што разгар восені — гэта зусім не нагода для суму і ляноты. Хутчэй наадварот — менавіта ў кастрычніку варта пачынаць нешта новае, рэалізоўваць самыя нечаканыя ідэі, быць пастаянна ў руху. І тады ні холад, ні недахоп сонечнага святла не змогуць паўплываць ні на настрой, ні на самаадчуванне.***

***Менавіта гэтым мы кіраваліся, калі вырашылі ў кастрычніку адкрыць у «Звяздзе» свайго роду новы сезон. Новыя рубрыкі, новыя дэталі ў афармленні газеты — дзеля таго, каб унесці ў вашу восень крыху разнастайнасці і яркіх фарбаў. Ці атрымалася — вырашаць вам, шаноўныя чытачы. Дзяліцеся заўвагамі і прапановамі. Галоўнае — што мы ў гэтай восені разам з вамі, і ўжо толькі з адной гэтай прычыны яна для нас цёплая і нясумная. Спадзяёмся, гэта ўзаемна!***

# Крыніца натхнення

ВЫТОКІ малой радзімы

Ціхую лясную мясцінку паблізу вёскі Смык Асіповіцкага раёна, дзе бруіцца светлая крыніца, людзі ведаюць даўно, прыходзяць сюды ў любую пару, каб зачарпнуць чысцюткай вады ад жыватворнага струменя. Спрадвеку шанавалі гэты выток, на змену старым ставілі новыя зрубы. Дзякуючы мясцоваму лясніцтву цяпер над крыніцай узведзена каплічка-купель.

Каля крыніцы — рукадзельніцы, спявачкі — прадаўжальніцы культурных традыцый вёскі Вяззе, суседняй з вёскай Смык, удзельніцы фальклорнага гурта «Вязанка» — Ірына ЗАБАЎСКАЯ *(злева),* Вольга САЛАЎЁВА і Марына ЛЕЙВА. Жанчыны адраджаюць забытыя традыцыі сваёй старонкі. І першай спробай гэтага адраджэння сталі вышытыя імі святочныя жаночыя строі свайго этнаграфічнага рэгіёна — вышываныя кашулі, фартухі, тканыя паясы.

— Мы наталяем свае творчыя сілы ад народных вытокаў. А вышыванне беларускіх геаметрычных арнаментаў на ручніках, кашулях і сарочках — асаблівая асалода для нашых душ, — кажа кіраўнік гурта Ірына Забаўская — сябра Беларускага саюза майстроў народнай творчасці.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Рэгіёны: па сутнасці справы

# Асаблівасці нарыхтовак: у краіне распачаўся сезон восеньскіх кірмашоў

**Сёння мы распачынаем новы звяздоўскі праект «Па сутнасці справы». Што за ён? Тлумачым: разам з нашымі карэспандэнтамі ў сталіцы і рэгіёнах мы будзем адсочваць самае важнае і цікавае, што прыцягвае ўвагу ў гэты час большасці нашых чытачоў. І першай тэмай мы абралі сезон асенніх нарыхтовак. Пагадзіцеся, сёлетнія цэны на садавіну і агародніну турбуюць не толькі вясковых бабуль і дзядуль, але нават і сталічную моладзь, што ў адчуванні надыходзячай зімы імкнецца назапасіць вітаміннай ежы.**

**Усім цікава, што і колькі каштуе, якія прадукты можна купіць танней і, галоўнае, — дзе? Нашы ўласныя карэспандэнты прайшліся па восенькіх кірмашах і высветлілі, на што ёсць попыт і дзе самая танная бульба... Аб гэтым вы даведаецеся з нашай падборкі.**

СТАР. 8–9

# НАРАДЖЭННЕ ЭЛІТЫ

ВЕСТКІ

Часового Рабочего-Селянского Радавого (Советского) Уряду Беларусі.

МАНІХВЭСТ

Часового Рабочего-Селянского Савецкого Праўдзіцельства Беларусі.

Таварышы і браты рабочыя, беднае сялянства і чырвонаармейцы Беларусі!

**Менавіта так мы вырашылі назваць новую рубрыку, прымеркаваную да 100-годдзя абвяшчэння БССР — самага трывалага дзяржаўнага ўтварэння са словам «Беларуская» ў назве, на падмурку якога мы заклалі і будуем нашу любімую незалежную краіну — Рэспубліку Беларусь. Справа сто гадоў назад рабілася і для сучаснікаў, і для нашчадкаў вялікая і вартая. Але за кожнай вялікай справай стаяць звычайныя людзі. Чым яны 100 гадоў назад кіраваліся ў сваіх памкненнях, якія адчайныя крокі рабілі, дзе выйгравалі, а дзе памыляліся, як склаўся іх лёс — вось пра гэта мы і раскажам вам у новай рубрыцы.**

СТАР. 4

З нагоды

## Аляксандр Лукашэнка запрасіў Сі Цзіньпіна наведаць Беларусь

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна і дружалюбны народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём абвяшчэння КНР, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

«Упэўненым крокам набліжаючыся да 70-гадовага юбілею стварэння новага Кітая, кіраўніцтва і грамадзяне краіны дэманструюць цвёрдую рашучасць дамагчыся пабудовы квітнеючай, стабільнай і перадавой дзяржавы. З кожным днём Кітайская Народная Рэспубліка ўскладае на сябе ўсё большую адказнасць за лёс сваіх саюзнікаў, з якімі сумесна ажыццяўляе рэалізацыю маштабнага праекта «Пояс і шлях», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што адносіны давернага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Кітаем выйшлі на новы віток развіцця.

У рамках рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых падчас сустрэчы двух лідараў у Цындаа 10 чэрвеня 2018 года, Аляксандр Лукашэнка запрасіў Сі Цзіньпіна прыняць удзел у глабальным форуме «Адзін пояс, адзін шлях», які плануецца правесці налета ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень». «Буду шчыра рады вам на гэтым знакавым міжнародным мерапрыемстве. Упэўнены, дадзеная падзея надасць дадатковы імпульс рэалізацыі ініцыятывы «Пояс і шлях», — падкрэсліў Прэзідэнт.

# ПЛЁННЫ ВІЗІТ

**У мінулую суботу завяршыўся візіт Прэзідэнта ў Таджыкістан.**

У аэрапорце Душанбэ беларускага лідара праводзіў асабіста Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон. Бакі падвялі вынікі візіту, які быў прысвечаны не толькі рабоце ў рамках СНД, але таксама і беларуска-таджыкскаму супрацоўніцтву.

Раней у той жа дзень беларускі і таджыкскі Прэзідэнты сустрэліся, каб абмеркаваць найбольш важныя праекты ў рамках двухбаковага ўзаемадзеяння. На сустрэчы кіраўнік беларускай дзяржавы пацвердзіў гатоўнасць нашай краіны прыняць актыўны ўдзел у плане індустрыялізацыі Таджыкістана.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь гатова ўнесці той уклад, які патрэбен для Таджыкістана, і выканаць тую работу, пра якую дамовіліся ў маі ў ходзе афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі ў гэтую краіну. Беларускі лідар таксама заявіў, што наша краіна поўная рашучасці выканаць свае абавязацельствы аб сумеснай вытворчасці трактарнай тэхнікі ў горадзе Гісар. Акрамя таго, ён дадаў, што будзе прададзена 300 трактароў беларуска-таджыкскай вытворчасці і ў Афганістан, гэта значыць, работа вядзецца і на суседнія дзяржавы.

Таксама кіраўнік беларускай дзяржавы падзякаваў прымаючаму боку за цеплыню і гасціннасць. У сваю чаргу, Эмамалі Рахмон адзначыў, што майскія дамоўленасці паспяхова рэалізуюцца, нададзены магутны імпульс двухбаковым адносінам, а завод у Гісары запускаецца ў поўным аб'ёме. Дарэчы, у бакоў маюцца дамоўленасці аб узаемадзеянні ў іншых сферах — напрыклад, садаводстве, кантакты ўжо наладжаны.

Падчас наведвання зборачнай вытворчасці трактарнай тэхнікі ў Гісары Прэзідэнты Беларусі і Таджыкістана дамовіліся аб далейшым развіцці прамысловай кааперацыі на таджыкскіх пляцоўках. Дэлегацыя агледзела вытворчы цэх і тэрыторыю прадпрыемства. Яшчэ адзін важны момант — бакі дасягнулі пагаднення ў сферы падаткаабкладання, што значна павысіць канкурэнтаздольнасць сумесна выраблянай прадукцыі. На думку Эмамалі Рахмона, збіраць трэба не толькі трактары — гэта могуць быць і камбайны, тэхніка для камунальнай гаспадаркі з магчымасцю наступнага экспарту і на рынкі трэціх краін.

У час наведвання прадпрыемства слова ўзяў і генеральны дырэктар Мінскага трактарнага завода Фёдар Дамаценка. Ён выказаўся аб перспектывах па лакалізацыі на вытворчасці ў Гісары і атрыманні сертыфікатаў на выкананне шэрагу работ непасрэдна ў Таджыкістане. Магчымы сумесны выпуск навяснога абсталявання, а таксама адкрыццё лініі па зборцы самаходных горных касілак, дадаў ён.

Яшчэ адным пунктам маршруту беларускай дэлегацыі сталі вінаградныя гаспадаркі «Багі самон» і «Ватан» у Турсунзадэўскім раёне. Кіраўнікі дзяржаў агледзелі сховішча вінаграду, беларускаму лідару расказалі ўсё аб мясцовых сартах і іх асаблівасцях. Вядома, не абышлося без дэгустацыі.

**Паводле БелТА.**

# ПАСКАРЭННЕ РУХУ НА ШАЎКОВЫМ ШЛЯХУ

## У «Вялікім камені» адкрыўся пункт мытнага афармлення

**Развіццё транспартных калідораў і ўдасканаленне лагістычнай інфраструктуры ў Беларусі з удзелам кітайскіх кампаній з'яўляецца прыярытэтнай задачай. Пра гэта паведаміў кіраўнік спраў Прэзідэнта Віктар ШЭЙМАН падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця пункта мытнага афармлення ў індустрыяльным парку «Вялікі камень».**

«Наша краіна для Кітая — праверaны часам, стабільны і надзейны партнёр у Еўрапейскім рэгіёне. Гэта мерапрыемства пацвярджае гатоўнасць Беларусі напаўняць ініцыятыву Шаўковага шляху канкрэтнымі праектамі — транспартнымі, лагістычнымі, інфраструктурнымі», — адзначыў Віктар Шэйман.

Паводле яго слоў, пункт мытнага афармлення (ПМА) «Вялікі камень» уяўляе сабой высокатэхналагічны аб'ект, які адпавядае ўсім сучасным міжнародным патрабаванням. У ПМА створаны ўсе ўмовы для камфортнага мытнага афармлення грузаў. На пачатковым этапе ў зоне мытнага кантролю адначасова могуць знаходзіцца 125 грузавых аўто. Плануецца, што прайсці працэдуру мытнага афармлення ў ПМА змогуць не менш за 20 тысяч аўтамабіляў у год.

«Ужо пачалася работа над перспектыўнымі праектамі па пашырэнні складской інфраструктуры, лагістычнай зоны парка, будаўніцтве рабатызаванага тэрмінала», — дадаў Віктар Шэйман.

У сваю чаргу **старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Юрый СЯНЬКО** паведаміў, што ў «Вялікім камені» ёсць магчымасць апрацоўкі тавараў, якія будуць прыбываць як аўтамабільным, так і авіяцыйным транспартам, бо побач знаходзіцца Нацыянальны аэрапорт Мінск. У перспектыве будуць апрацоўвацца і тыя грузы, якія перавозяцца па чыгунцы.

На тэрыторыі ПМА размешчаны склад часовага захоўвання і мытны склад. Плошча кожнага з іх складае пяць тысяч квадратных метраў. Ёсць магчымасці пашырэння як зоны мытнага кантролю, так і складскіх памяшканняў.

Адкрыццю новага пункта мытнага афармлення папярэднічалі канструктыўныя перагаворы і падпісанне пагадненняў з кіраўніцтвам мытнай службы КНР, правядзенне шэрагу сустрэч і мерапрыемстваў на тэрыторыі Кітая і Беларусі, дасягненне дамоўленасцяў аб інфармацыйным абмене, супрацоўніцтве па ўсіх кірунках мытнай справы.

Для ПМА прадугледжана шырокая спецыялізацыя па ажыццяўленні мытных аперацый. Тут будуць афармляцца тавары, што перамяшчаюцца аўтамабільным транспартам; тавары, што змяшчаюцца пад мытную працэдуру свабоднай мытнай зоны; вылічальныя машыны, камп'ютары, тэлефоны, тэлевізары і іншыя.

Напярэдадні ў ПМА былі праведзены кантрольныя мерапрыемствы па тэсціраванні падачы і афармлення электронных мытных дакументаў. Сімвалічна, што адкрыццё мытнага тэрмінала супала з галоўным дзяржаўным святам Кітая — Днём утварэння КНР.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
**Фота БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Колькасць ахвяр землетрасення і цунамі ў Інданезіі перавысіла 1200 чалавек

Колькасць загінулых у выніку землетрасення і цунамі на інданезійскім востраве Сулавесі перавысіла 1,2 тыс. чалавек. Пра гэта паведамляе выданне The Straits Times са спасылкай на даныя Нацыянальнага агенцтва па пошуку і выратаванні.

«Ратавальнікі чакаюць павелічэння колькасці ахвяр, паколькі сталі паступаць даныя з раёна Дунгала (правінцыя Цэнтральны Сулавесі), дзе залягаў ачаг землетрасення магнітудай 7,4», — адзначае газета. Раней паведамлялася пра 832 загінулых у горадзе Палу, адміністрацыйным цэнтры правінцыі. Акрамя таго, раненні атрымалі больш за 900 чалавек, якіх эвакуіравалі самалётамі ваенна-транспартнай авіяцыі.

Землетрасенне магнітудай 7,4 адбылося ў правінцыі Цэнтральны Сулавесі 28 верасня, на працягу амаль дваіх сутак было зафіксавана каля 170 паўторных штуршкоў. Моцныя падземныя штуршкі сталі прычынай узнікнення цунамі, вышыня хваляў падчас якога складала тры-пяць метраў.

Аднак Агенцтва метэаралогіі, клімату і геафізікі праз 30 хвілін пасля першых штуршкоў адмяніла пагрозу цунамі, бо прыборы не здолелі зафіксаваць набліжэнне стыхіі.

### Сербія прывяла армію ў поўную баявую гатоўнасць з-за дзеянняў Косава

Прэзідэнт Сербіі Аляксандр Вучыч загадаў прывесці ўзброеныя сілы Сербіі ў поўную баявую гатоўнасць. Пра гэта паведамляе сербскае агенцтва ТАНЮГ. Загад перададзены начальніку генштаба арміі Сербіі.

Нагодай да гэтага сталі дзеянні косаўскіх паліцэйскіх на адміністрацыйнай мяжы Сербіі і Аўтаномнага краю Косава і Метохія. Паводле інфармацыі сербскага тэлеканала РТС, 60 супрацоўнікаў спецназа паліцыі Косава ROSU падышлі да Газіводскага возера, якое забяспечвае вадой ГЭС «Газівода», і занялі Цэнтр экалогіі і спорту ў абшчыне Зубін Паток. Паводле інфармацыі МУС Сербіі, дзеянні ROSU суправаджаліся затрыманнямі «сербаў, якія не здзейснілі якіх-небудзь правапарушэнняў».

Па трывозе паднятыя і падраздзяленні спецназа сербскай паліцыі, паведаміў кіраўнік МУС Нябойша Стэфанавіч. Сітуацыя застаецца напружанай, але паведамленняў аб новых інцыдэнтах пакуль няма, адзначае тэлеканал РТС. Рух на пад'ездзе да ГЭС не перакрываўся.

Дырэктар Канцылярыі па пытаннях Косава і Метохіі пры ўрадзе Сербіі Марка Джурыч напрамую абвінаваціў у гэтых дзеяннях прэзідэнта Косава Хашыма Тачы. Паводле яго слоў, косаўскія спецназаўцы арыштавалі ўсіх, хто быў на дарозе, якая вядзе да ГЭС «Газівода», а затым затрымалі сербаў, якія знаходзіліся ў Цэнтры экалогіі і спорту. Джурыч паабяцаў не пакінуць гэтыя дзеянні без адказу. Паводле яго слоў, прэзідэнт Сербіі цяпер праводзіць нарады з начальнікам генштаба краіны.

*Рэспубліка Косава — часткова прызнаная дзяржава. Сербія не прызнае яе незалежнасць і называе гэты рэгіён Аўтаномным краем Косава і Метохія, хоць фактычна ўладамі Сербіі Косава не кантралюецца. На поўначы рэспублікі пражываюць сербы.*

### Урад Ліберыі паведаміў аб страце 104 мільёнаў ліберыйскіх долараў

Здарылася гэта не з-за няўдалых інвестыцый або махлярства, грошы згубіліся ў літаральным сэнсе.

Банкноты на гэтую суму былі заказаныя цэнтральным банкам Ліберыі ў замежнай друкарні і прапалі па дарозе ў краіну. Расследаванне пакуль не дало вынікаў.

У Індыі ў жніўні таксама здарыўся скандал вакол грошай, але па іншай прычыне: газета South China Morning Post паведаміла, што індыйскія рупіі будуць друкавацца ў Кітаі.

Урад Індыі абверг гэтае паведамленне, заявіўшы, што на самай справе ў Індыі ўсе наяўныя грошы друкуюцца ў чатырох індыйскіх друкарнях ва ўмовах павышанай бяспекі.

Свята ў хату

# ШЛЯХ ДА ХЛЕБА

**Мінскі абласны фестываль-кірмаш «Дажынкі» прайшоў 29 верасня ў старажытным Мядзеле. Адкрыў свята старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА, якому хлебаробы ўручылі сімвал сёлетняга ўраджаю — свежаспечаны каравай.**

— Гэтае свята каштоўнае для нас удвая, як даніна павагі да нашых продкаў і нагода выказаць словы ўдзячнасці ўсім працаўнікам сяла. Дажынкі — гэта добрая традыцыя ўшаноўваць тых, хто добрасумленна працаваў у полі, праяўляючы высокі прафесіяналізм, адказнасць, тых, хто дасягнуў найбольш высокіх вынікаў. Сёлета неспрыяльныя ўмовы надвор'я значна паўплывалі на ўраджайнасць збожжых культур. І нам не ўдалося дасягнуць мінулагодніх паказчыкаў. Але, нягледзячы на гэта, Мінская вобласць па-ранейшаму ўтрымлівае статус асноўнай жытніцы краіны і надзейнага пастаўшчыка харчавання, — адзначыў губернатар. — Гэта перш за ўсё заслуга нашых працалюбівых людзей: кіраўнікоў, спецыялістаў, механізатараў, камбайнераў, вадзіцеляў, студэнтаў, работнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, гандлю і грамадскага харчавання, культуры, медыцыны, бытавога абслугоўвання насельніцтва, шэфаў сталічных арганізацый, якія аказалі істотную падтрымку аграрыям. Асаблівая ўдзячнасць сем'ям, жонкам, дочкам, якія падчас жніва ўзялі хатнія клопаты на свае плечы. Нельга не падзякаваць і жыхарам Мядзела, якія шмат прыклалі намаганняў, каб горад змяніўся да лепшага, стаў яшчэ больш прыгожы, утульны.

Анатоль Ісачанка адзначыў, што ў лідарах сёлетняга жніва Дзяржынскі раён, які другі год запар утрымлівае першынство. За ім ідуць Пухавіцкі і Мінскі раёны, якія занялі другое і трэцяе месцы адпаведна. Найлепшымі сярод сельгасарганізацый сталі адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Гастэлаўскае» Мінскага раёна, агракамбінат «Дзяржынскі» і «Новае жыццё» Нясвіжскага раёна.

У межах свята адбылася яшчэ адна важная для жыхароў Мядзела і раёна падзея — урачыстае адкрыццё ўстановы па заключэнні шлюбаў. Яна размясцілася ў будынку новай гасцініцы. Гэта прасторнае, светлае памяшканне з пакоямі для жаніха і нявесты, пакоем для гасцей, дзе пасля ўрачыстай цырымоніі і яны могуць павіншаваць маладых і пажадаць ім шчасця, здароўя, сямейнага дабрабыту. Першай парай, якая ажанілася тут, сталі Аляксандр Дземідовіч і Святлана Ціхановіч. Наваспечаную сям'ю павіншаваў Анатоль Ісачанка, які прыняў удзел ва ўрачыстым адкрыцці ўстановы:

— Гэты будынак створыць камфортныя ўмовы для работы. Няхай яго дзверы ніколі не закрываюцца, а людзі рэгіструюць шлюбы і дзяцей. Са святам!

Для гасцей і жыхароў фестывалю яго арганізатары распрацавалі цікавую і змястоўную праграму з улікам іх узросту, густаў, інтарэсаў. Для дзяцей і моладзі былі адкрыты інтэрактыўныя пляцоўкі, арганізаваны квэст па саламяных скульптурах. Даволі цікавай атрымалася фотавыстаўка «З гісторыі «Дажынак» на Міншчыне з 1998 да 2017 года». Шмат гледачоў сабралі канцэрты аматарскіх і прафесійных выканаўцаў і калектываў. Усе ахвотныя змаглі азнаёміцца з выстаўкай «Маёй зямлі куточак дарагі». Галоўная яе ідэя: Міншчына — вялікі агульны дом, дзе для кожнага ёсць месца, дзе захоўваюцца даўнішнія традыцыі рамёстваў, беларускай традыцыйнай кухні, народныя абрады. Кожны раён вобласці прадэманстраваў тут свой этнічны брэнд, расказаў, чым славіцца гэты рэгіён. У прыватнасці, слуцкія майстры паказалі ўсім ахвотным старажытны спосаб пляцення слуцкіх паясоў. Ярка, маляўніча, крэатыўна прайшоў касцюміраваны парад прадстаўнікоў раёнаў. Хлопцы і дзяўчаты ў прыгожых строях неслі сімвалы ўраджаю: снапы збожжа, саламяныя фігуры, караваі.

**Асаблівасць сёлетніх «Дажынак» у тым, што ўпершыню тут адбыўся фінал абласнога конкурсу «Уладар сяла», а сельская моладзь прадставіла свае падворкі як сімвал працавітасці, любові і павагі да зямлі, якая корміць, прыносіць дастатак, мір і згоду ў сям'ю.** Чаго тут толькі не было: сельгаспрадукцыя з асабістых падворкаў, нацыянальныя стравы, напоі! Прадукцыю, вырашчаную сваімі рукамі, паказалі і людзі старэйшага пакалення з Мядзельскага, Вілейскага, Валожынскага і Маладзечанскага раёнаў на выстаўцы «Ветэранскія падворкі».

Фота БелТА.

З самага ранку працавалі і гандлёвыя рады. На вуліцы Набярэжнай яны раскінуліся амаль што на два кіламетры. Тут сваю прадукцыю прапаноўвалі прадпрыемствы перапрацоўкі, райспажыўсаюзаў, фермеры, прадпрымальнікі Мінскай і іншых абласцей краіны. Асабліва шмат пакупнікоў было каля рэстарана пад адкрытым небам «Вугарок», дзе можна было пакаштаваць смачныя стравы — прыгатаванага вугра, шчупака, фаршыраванага карпа, ды іншую рыбку. Не менш ажыўлена было і на пляцоўцы «Рыбны край», дзе гандлявалі рыбгасы Міншчыны. Прыемна здзівіў пакупнікоў Любанскі рыбны завод, які прывёз на свята палявую кухню і прапаноўваў пакупнікам духмяную юшку.

Дажынкі гулі да самага позняга вечара. Напрыканцы свята неба расквецілі прыгожы феерверк.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

З нагоды

# Выпускнікамі сталі 22 тысячы ўрачоў

## Гродзенскаму дзяржаўнаму медыцынскаму ўніверсітэту — 60 гадоў

**З нагоды юбілею ў сценах ВНУ прайшоў урачысты сход з удзелам прадстаўнікоў міністэрстваў, ведамстваў, мясцовых уладаў, кіраўнікоў медыцынскіх установ, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта.**

Перад прысутнымі на экране прайшла гісторыя стварэння ВНУ, якая бярэ пачатак у 1958 годзе. Краіна рыхтавалася сустрэць 40-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі, і да гэтай даты было вырашана адкрыць трэці ў Беларусі медыцынскі інстытут. Першы набор складаўся з выпускнікоў школ, а таксама з прадстаўнікоў калгаснай і рабочай моладзі. Было прынята 250 чалавек, якія ў 1964 годзе, пасля завяршэння вучобы, раз'ехаліся па краіне, у асноўным па сельскіх населеных пунктах. Многае змянілася з моманту першага выпуску. Быў узведзены новы корпус, інстытут «перарос» ва ўніверсітэт, удасканальвалася вучэбная і практычная базы. За 60 гадоў падрыхтавана звыш 22 тысяч урачоў. Прафесарска-педагагічны склад вырас з 30 чалавек да 506. Тут працуе 45 кафедраў, навукова-даследчая лабараторыя, прафесарска-кансультацыйны цэнтр.

Як адзначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ,** амаль 80 % медыцынскіх кадраў для рэгіёна падрыхтаваны менавіта гродзенскім універсітэтам. Заслугі ўстановы адзначаны спецыяльнымі прэміямі ўрада Беларусі, СНД, тут працуе 14 навуковых школ, напрацоўкі якіх вядомы за межамі краіны.

Выпускнікі ўніверсітэта складаюць чвэрць усёй урачэбнай супольнасці краіны, адзначыў **міністр аховы здароўя Беларусі Валерый МАЛАШКА.** Зараз перад педагогамі ставяцца новыя задачы, якія арыентуюць будучых спецыялістаў на персаніфікаваную медыцыну, авалодванне камунікатыўнымі навыкамі.

— Мы не стаім на месцы, змяняем падыходы да адукацыі, — падкрэсліў Валерый Малашка. — Арыентуем студэнтаў на практыку, якасную медыцынскую дапамогу з улікам высокіх тэхналогій, і для гэтага ў рэгіёне створана добрая база.

Па словах міністра, у краіне будзе ўдзяляцца ўвага падрыхтоўцы ўрача агульнай практыкі. Гэта не змена шыльды, а вельмі сур'ёзнае перараз меркаванне рэсурсаў. Нагрузка на такога ўрача будзе зменшана, а яго каманда павялічыцца. Гэта будзе свайго роду галоўны ўрач на сваім тэрапеўтычным участку. Будзе развівацца кірунак, які арыентуе ўрача на работу са здаровым пацыентам, і гэтыя тэхналогіі закладваюцца ў адукацыйны працэс. Міністр пажадаў педагогам і студэнтам Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта плённай работы ў новым кірунку і выказаў надзею на ажыццяўленне гэтых ідэй.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Надвор'е

# Месцамі дождж плюс моцны парывісты вецер

**Дзякуючы антыцыклону першы дзень кастрычніка выдаўся сонечным, але ў сярэдзіне тыдня атмасферныя франты прынясуць дажджы, тэмпература панізіцца. На гэтым тыдні будзе халаднаватае ветранае надвор'е з дажджамі, а ў выхадныя чакаецца цёпла, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду і чацвер чакаецца ветранае з дажджамі надвор'е. У сераду ўначы пераважна па паўночным захадзе, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, якія будуць суправаджацца парывістым ветрам, у асобных раёнах — моцным. Тэмпература паветра ўначы будзе 2—8 цяпла, удзень — ад плюс 7 да плюс 13 градусаў. У чацвер пераважна па паўночна-ўсходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах захаваецца моцны парывісты вецер. Уначы будзе ад 2 да 7 вышэй нуля, днём — 7—13 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу паўднёвыя раёны краіны апынуцца пад уплывам вобласці павышанага ціску. Па паўночнай частцы ўмовы надвор'я будзе вызначаць вільготная паветраная маса, тут месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад аднаго да 8 цяпла, па паўднёвым усходзе краіны месцамі замаразкі — ад мінус аднаго да мінус 3 градусаў. Удзень прагназуецца ад плюс 9 да плюс 15 градусаў, па поўдні краіны паветра прагрэецца да 17 цяпла. А далей надвор'е палепшыцца, і, паводле папярэдняга прагнозу, у выхадныя дні чакаецца цёплае і ў асноўным без ападкаў надвор'е.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Запрашальнік

# ЧОРНА-БЕЛЫЯ «КАНТРОЛЬКІ»

**Ужо сёння ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адбудзецца адкрыццё выстаўкі «З палескага архіва Зоф'і Хамянтоўскай».**

Архіў Зоф'і Хамянтоўскай, адной з найцікавейшых фотамастачак міжваеннага перыяду, з 2008 года знаходзіцца ў апрацоўцы фонду «Археалогія Фатаграфіі». У велізарнай калекцыі, якая налічвае каля 6500 негатываў і 4500 пазітываў, захавалася не так шмат выставачных адбіткаў. Большасць з іх не пражыла вайну. Ацалелыя здымкі — гэта невялікія аўтарскія «кантролькі», што паказваюць перш за ўсё працэс працы фотамастачкі і яе аўтарскі адбор любімых кадраў.

Выстаўка прадстаўляе некалькі дзясяткаў з іх. Фотаздымкі невялікага фармату 1928—1933 гадоў паказваюць родавы маёнтак Зоф'і Хамянтоўскай у Парахонску. У экспазіцыю ўвайшлі шматлікія фотаздымкі краявідаў у «піктарыяльнай» эстэтыцы, зробленыя «Лейкай», і здымкі, якія дакументуюць жыццё мясцовых жыхароў.

Прэзентацыя суправаджаецца паказам фільма «Я здымаю». Гэта ўнікальны матэрыял, сабраны з фрагментаў стужак Хамянтоўскай канца 1920-х гадоў, які прадстаўляе асабістае жыццё творцы, яе сям'і і сяброў.

Кароткаметражны фільм быў змантаваны са знойдзеных у архівах унікальных дакументальных кадраў, знятых самой мастачкай. Аўтарскі каментарый да фільма напісаў Мікалай Лазінскі, а тэкст прачытала Юлія Станішэўская. Гэты матэрыял, падобна як і сам факт здымання фільмаў Хамянтоўскай, доўга заставаўся невядомым, хоць на выстаўцы ў Познані фотамастачка дэбютавала не паказам здымкаў, а менавіта фільмам. Алічбоўка фільма была прафінансавана Нацыянальным аўдыявізуальным інстытутам у рамках праграмы «Лічбавая спадчына».

Прэзентаваны выбар здымкаў упершыню быў прадстаўлены ў рамках выстаўкі «Маёнтак. Скульптуры з калекцыі сям'і ван Роўз, а таксама фільмы і фатаграфіі з архіва Зоф'і Хамянтоўскай» у Крулікарні (Варшава, сакавік — 17 мая 2015).

Выстаўка Зоф'і Хамянтоўскай з'яўляецца другой прэзентацыяй збораў гэтай аўтаркі ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі. Праект праходзіць у межах Месяца фатаграфіі ў Мінску: www.mfm.by/en.

**Варвара ГОМАН.**

# НАРАДЖЭННЕ ЭЛІТЫ

**А для пачатку — аб тым, як і з кім маладая рэспубліка рабіла першыя крокі, аб чалавечым фактары ў гісторыі — мы пагутарылі з загадчыкам аддзела навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук кандыдатам гістарычных навук Сяргеем ТРАЦЦЯКОМ.**

***— Сяргей Аляксандравіч, хто сто гадоў таму прымаў рашэнне аб стварэнні ССРБ, якая фактычна стала прадвесніцай БССР? Гэта была цалкам ініцыятыва Масквы ці можна сказаць, што на гэта рашэнне паўплывалі і беларускія дзеячы?***

— Рашэнне аб стварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі як суверэннай і незалежнай дзяржавы было прынята ў Маскве. Гэтаму спрыяў найперш збег знешнепалітычных абставін, якія на той момант складваліся. На тое, што ўтваралася фактычна незалежная дзяржава, мясцовае беларускае кіраўніцтва (Аблвыканкамзах) і беларускія камуністы, якія групаваліся вакол беларускіх камуністычных секцый Белнацкама, практычна не ўплывалі ніяк, для іх саміх, можна сказаць, гэта было нечаканасцю. Камуністычныя секцыі Белнацкама стаялі на пазіцыі, што Беларусь павінна быць аўтаномнай сацыялістычнай рэспублікай у складзе РСФСР. Але ў цэнтры палічылі мэтазгодным стварыць незалежную рэспубліку, якая пад шчыльным кантролем адыграе адпаведную ролю, стане часткай так званага чырвонага буфера — фармальна незалежных дзяржаў, якія аддзяляюць маладую краіну Саветаў ад варожага капіталістычнага лагера. Паводле першых планаў абвяшчэння новай рэспублікі, яе граніцы павінны былі ахапіць толькі Мінскую і Гродзенскую губерні. Смаленская губерня пакідалася ў складзе ССРБ, але толькі па жаданні самой губерні, бо там у той час знаходзіліся ўсе партыйныя і дзяржаўныя кіруючыя органы Заходняй вобласці. Магілёўская і Віцебская губерні першапачаткова пакідаліся за РСФСР. Але супраць такога рашэння выступілі адразу і беларускія камуністычныя секцыі, і смаленскія таварышы, якія групаваліся вакол Аблвыканкамзаха. Такое дзяленне разбурала Беларусь як цэласны эканамічны, этнакультурны і палітычны арганізм.

У рэшце рэшт Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі, абвешчаная І з'ездам Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі, ахапіла практычна ўсе тыя тэрыторыі, якія акадэмік Яўхім Карскі аднёс да беларускіх. Але, як высветлілася вельмі хутка, незалежная рэспубліка ў такім выглядзе патрэбная цэнтру не была. Ды і беларускі нацыянальны камісарыят падчас дзеяння Брэсцкага міру ўсяляк прапагандаваў савецкае існаванне Беларусі без адрыву ад РСФСР. Думка аб тым, што Беларусь павінна быць самастойным дзяржаўным утварэннем у федэратыўным саюзе з Савецкай Расіяй, прагучала 12 снежня 1918 года ў Мінску. Тады па ініцыятыве Мінскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта адбылася нарада сялянскіх дэлегатаў губерні, якая і прыняла рашэнне аб тым, што Беларусь і Літва павінны скласці асобную камуну ў саюзе з Савецкай Расіяй. Кіраваў гэтай нарадай Ісак Рэйнгольд, старшыня Мінскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Гэта сялянская нарада нейкім чынам была вызначальная пры прыняцці рашэння аб стварэнні ССРБ?***

— З пункту гледжання гістарычнай рэтраспектывы гэтая нарада на рашэнне цэнтра ніяк не паўплывала, але яна дала дадатковы аргумент якраз-такі беларускім камуністычным секцыям у тым, каб ставіць перад савецкім урадам у Маскве пытанне аб неадкладным самавызначэнні Беларусі на дзяржаўных пачатках.

***— Беларускія камуністычныя секцыі — гэта было свайго роду нацыянальнае лобі ў Маскве?***

— Яны сто гадоў назад дзейнічалі ў падкантрольных бальшавікам буйных гарадах Расіі, там, дзе была значная колькасць беларусаў — рабочыя, салдаты, бежанцы. Секцыі бяруць свой пачатак з Другога з'езда бежанцаў Беларусі, які адбыўся летам 1918 года ў Маскве. Пасля таго як Брэсцкі мір быў скасаваны і пачаўся Заходні паход Чырвонай Арміі, такая секцыя пачала дзейнічаць і ў Мінску. Яна і разгарнула прапаганду прасоўвання савецкай улады на захад ад «лініі старых акопаў» (Мядзел — Смаргонь — Валожын — Ляхавічы — Пінск). У той час як Аблвыканкамзах у Смаленску і Паўночна-Заходні абкам Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) на чале з Аляксандрам Мясніковым, Вільгельмам Кнорыным і Карлам Ландэрам быў супраць якой бы то ні было беларускай работы, калі рашуча супраць беларускай работы ў краі нават пад савецкім сцягам выступілі камуністы Віцебскай губерні, Мінскі губернскі рэўкам і Мінскі ваенсавет на чале са Станіславам Берсанам палічылі, што менавіта беларускія камуністы і павінны ўсталёўваць савецкую ўладу на захад ад «лініі старых акопаў».

Калі беларускія камуністычныя секцыі прымалі рашэнне аб неадкладным самавызначэнні Беларусі на савецкіх пачатках як аўтаноміі ў складзе Савецкай Расіі, у цэнтры было вырашана абвясціць суверэнную рэспубліку. І ўсе падпарадкаваліся гэтаму рашэнню ў парадку партыйнай дысцыпліны. І адпаведна, кіраванне павінна было ажыццяўляцца з цэнтра. Фактычна кіруючыя камуністычныя партыі абвешчаных рэспублік уваходзілі ў склад РКП(б) на правах абласных партыйных арганізацый. А ўрады гэтых рэспублік былі абмежаваныя ў правах весці гаспадарчую і ваенную дзейнасць. У гаспадарчай галіне ўсе дзеянні ўзгадняліся з Масквой, а ваенныя фарміраванні былі ў складзе Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

***— Якім чынам меркавалася ажыццяўляць кіраўніцтва навастворанай рэспублікай напачатку — як бы там ні было, урад мусіў быць паўнавартасным? Ці бачылася кіраўніцтва менавіта нацыянальным?***

— Захавалася сведчанне, што Сталін у дыялогу з Мясніковым па тэлеграфе 24 снежня 1918 года не выключаў, што ў складзе ўрада новай рэспублікі аблвыканкамзахаўцы акажуцца ў меншасці. Прапанова стварыць урад была дадзена кіраўніцтву беларускіх камуністычных секцый, на чале якіх на той момант стаяў Зміцер Жылуновіч. Тут варта заўважыць, што паміж Аблвыканкамзахам і секцыямі былі варожасць і непрымірымая барацьба. Сам Жылуновіч лічыў, што Мяснікова, старшыні Паўночна-Заходняга абкама партыі, ва ўрадзе не павінна быць ні ў якім выпадку. Але Мяснікоў павінен быў узначаліць бюро навастворанай Кампартыі Беларусі... На тры чвэрці новы ўрад складаўся з прадстаўнікоў беларускіх камуністычных секцый, на яго чале быў Жылуновіч, але Мяснікоў мог правесці любое рашэнне цэнтра ў парадку ўсё той жа партыйнай дысцыпліны.

**«Усё павінна было прайсці гладка: падначаленыя на месцах проста выканаюць волю Цэнтральнага камітэта. Але і «секцыі», і «абласнікі» адмовіліся ад гэтай ідэі: і для адных, і для другіх Беларусь і яе існаванне як асобнай рэспублікі сталі ўжо даўно не пустым гукам, гэта пытанне для абедзвюх груп аказалася прынцыповым».**

Жылуновіч меркаваў, што пытанне аб урадзе будзе вырашаць І з'езд Саветаў Беларусі. А Мяснікоў вырашыў пайсці іншым шляхам — рэспубліку абвяшчаць на партыйным з'ездзе. 30 снежня 1918 года з яго падачы Шостая абласная партыйная канферэнцыя ў Смаленску стала па дырэктыве з цэнтра І з'ездам Кампартыі Беларусі, і на ёй сярод іншых было разгледжана пытанне аб стварэнні ССРБ. У гэты час на з'езд з Масквы прыбылі дэлегацыі беларускіх камуністычных секцый на чале са Змітром Жылуновічам і Аляксандрам Чарвяковым, яны прывезлі з сабой узгоднены са Сталіным Маніфест аб стварэнні часовага рабоча-сялянскага ўрада новай рэспублікі. Урад павінен быў стварацца на парытэтных пачатках. Пачалася спрэчка за партфелі, і Мяснікоў здолеў дабіцца, што дзве трэці пасад ва ўрадзе дасталося «абласнікам» — людзям, якія выступалі супраць беларускай рэспублікі ў любым яе выглядзе. На чале ўрада аказаўся Жылуновіч, але кіраўніком спраў стаў Кнорын, які дзяржаўную пячатку выдаваў Жылуновічу толькі пад распіску.

Але тое, што адбылося ўжо ў лютым 1919-га, для многіх было як халодны душ. Цэнтр задумаў аб'яднаць Беларусь і Літву ў адзіную рэспубліку. Пры гэтым ад Беларусі адбіраліся ўсходнія тэрыторыі. Усё павінна было прайсці гладка: падначаленыя на месцах проста выканаюць волю Цэнтральнага камітэта. Але і «секцыі», і «абласнікі» адмовіліся ад гэтай ідэі: і для адных, і для другіх Беларусь і яе існаванне як асобнай рэспублікі сталі ўжо даўно не пустым гукам, гэта пытанне для абедзвюх груп аказалася прынцыповым. Праўда, І з'езд Саветаў, які неўзабаве адбыўся, вымушаны быў прыняць гэтае рашэнне — зноў жа ў парадку партыйнай дысцыпліны. Але падзеі, якія папярэднічалі гэтаму, засведчылі: у Беларусі склалася ўласная палітычная эліта з уласнымі палітычнымі інтарэсамі. Гэта цэнтру не спадабалася, бо «сепаратызму пад савецкім сцягам» не павінна было быць, таму Жылуновіча накіравалі спачатку на журналісцкую работу ў Харкаў, а пасля на палітычную работу ў Чырвоную Армію, а Мяснікова адклікалі ў Маскву на павышэнне, абарваўшы яму ўсе сувязі. Чарвякоў застаўся на пасадзе намесніка народнага камісара асветы. У навастворанай Сацыялістычнай Савецкай Рэспубліцы Літвы і Беларусі ў кіраўніцтве беларусаў не было...

А 31 ліпеня 1920 года, пасля вызвалення Мінска ад палякаў, адбылося другое абвяшчэнне ССРБ — праўда, толькі на тэрыторыі Мінскай і часткова Гродзенскай губерні, як хацелі зрабіць у снежні 1918-га. Тут ужо рэй вялі Чарвякоў і Кнорын, які да яго далучыўся. Уладу ў Мінску ўзяў на сябе Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Беларусі. З самага пачатку ўрад Чарвякова ўзяў курс на беларусізацыю Беларусі — выданне прэсы і лістовак распачалося на ўсіх чатырох дзяржаўных мовах, у тым ліку і на беларускай.

***— Якія яшчэ першыя крокі новага ўрада новай рэспублікі можна сёння назваць дбаннем менавіта пра нацыянальнае (у розных сферах — ад культуры і навукі да эканомікі)?***

— Урад Савецкай Беларусі яшчэ ў студзені 1919 года прыняў рашэнне аб стварэнні нацыянальнага ўніверсітэта. Прычым спецыяльна дзеля гэтага быў запрошаны акадэмік Яўхім Карскі, той самы, хто першы заявіў пра беларусаў як пра асобны народ. Ён распрацаваў праект універсітэта і агучыў яго яшчэ на І Усебеларускім з'ездзе ў снежні 1917-га. Карскі працягваў работу над збіраннем навуковых і педагагічных сіл для новага ўніверсітэта нават ва ўмовах польскай акупацыі, застаўшыся ў Мінску... Але рэктарам установы ён так і не стаў — яго ў канцы 1920 года адклікала ў Петраград Расійская акадэмія навук — там тады быў востры недахоп навуковых кадраў. Пасаду рэктара заняў Уладзімір Пічэта, які пасля ад'езду Карскага ўзначаліў камісію па стварэнні ўніверсітэта. А Мінскім педагагічным інстытутам кіраваў Усевалад Ігнатоўскі...

Калі казаць пра эканоміку... У плане сялянскай палітыкі беларускія і літоўскія (падчас агульнай рэспублікі) кіраўнікі былі больш рэвалюцыйныя, больш катэгарычныя, чым у Расіі. Яны стаялі на прынцыпах аб'яднання ў камуны яшчэ задоўга да калектывізацыі. З-за палітыкі ваяўнічага атэізму яны яшчэ больш пасварыліся з сялянамі. Пасля 1920-га Чарвякоў зноў зрабіў стаўку на насаджэнне сельскагаспадарчых камун, якія найперш дазвалялася арганізоўваць калектывам дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. Толькі ў 1921 годзе была праведзена зямельная рэформа, па якой сяляне атрымалі частку памешчыцкай зямлі.

***— Усё гэта адбывалася на тэрыторыі шасці паветаў, якія і складалі тады Беларускую рэспубліку. А ці мела яе тагачаснае кіраўніцтва дачыненне да вяртання беларускіх зямель?***

— Пытанне аб пашырэнні тэрыторыі рэспублікі паўстала ўжо ў канцы 1920 года. За подпісам вялікай групы беларускіх камуністаў у Маскву пайшла запіска аб тым, што час далучыць да рэспублікі ўсходнія вобласці: каб тыя беларусы, што засталіся на захад ад мяжы, бачылі, што савецкая ўлада дбае пра іх радзіму. Але ідэя ажыццявілася толькі пры стварэнні СССР, ужо ў складзе адной дзяржавы, калі ў прынцыпе стала не так важна, каму якая вобласць належыць.

***— Што з вышыні 100 гадоў можна сказаць пра дзеячаў БНР, якія сталі працаваць у БССР, — яны перамянілі свае погляды ці проста рупіліся аб нацыянальным беларускім дзяржаўным утварэнні (няважна, пад чыёй эгідай)?***

— Яны не перамянілі погляды, але яны бачылі і разумелі, што іншай альтэрнатывы для стварэння рэальнай беларускай дзяржаўнасці ў той час і ў тых варунках проста не было.

***— Людзі, якія ўсё пачыналі ў БССР, — хто яны больш: ідэалісты ці прагматыкі?***

— Сказаць складана. У іх спалучаўся і прагматызм, і ідэалізм. Той жа Чарвякоў быў ідэалістам, таму што верыў у светлую будучыню. Але ён быў і прагматыкам, калі зыходзіў з таго, што нельга ўзяць усё, што можна ўзяць (прыклад — паступовае вырашэнне тэрытарыяльнага пытання). Ён хацеў стварыць умовы для сацыялізму як мага хутчэй, але як мага хутчэй ён хацеў і аднавіць народную гаспадарку — адсюль і камуны, і тое, як пасля праходзіла ў нас калектывізацыя... Зміцер Жылуновіч, чалавек творчы, аказаўся няздатным да палітыкі, але менавіта ён у 1918-м дабіўся ад Сталіна, на той час народнага камісара па справах нацыянальнасцяў РСФСР, дазволу на стварэнне беларускіх нацыянальных камуністычных секцый, з якіх вельмі многае пачалося.

***— З пункту гледжання гістарычнай навукі можна абгрунтаваць думку аб тым, што нараджэнне і станаўленне нацыянальнай эліты адбывалася разам з нараджэннем і станаўленнем БССР як найбольш трывалага і доўгатэрміновага праекта дзяржаўнасці?***

— Усякая дзяржава, калі яна паўстае, пачынае фарміраваць сваю эліту. А пасля ўжо эліта фарміруе дзяржаву. Фарміраванне эліты ў Савецкай Беларусі адбылося вельмі хутка. Ужо, як згадвалася ў гутарцы раней, у лютым 1919 года ўсім стала ясна, што гэта эліта ёсць і яна мае свой адрозны пункт гледжання. На жаль, гэтая першая плынь была змецена рэпрэсіямі 20-30-х гадоў. Другая плынь — тэхнакратычная, не асабліва дбала пра мову і культуру, але вырашала праблемы эканомікі — гэтую эліту знішчыла вайна. Пасля вайны ў Беларусі з'явілася ўнікальная эліта — «партызанская», якая кіравала на працягу сарака гадоў. З гэтымі людзьмі лічылася цэнтральная ўлада, у многім дзякуючы ім мы атрымалі ў спадчыну краіну з высокім узроўнем адукацыі, з развітымі буйнымі прадпрыемствамі.

***— А сённяшняя эліта з пункту гледжання найноўшай гісторыі?***

— Гэтая з'ява абсалютна невядомая, новая для нашай гісторыі, бо ўпершыню нацыянальная дзяржаўная эліта фарміруецца ў незалежнай краіне. Але ў прадстаўнікоў гэтай эліты былі выдатныя папярэднікі, пра якіх мы павінны як мінімум ведаць.

**Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Анастасія КАЛАШНІКАВА:

# «Біць прыгожа мяшок? На гэта здольныя многія...»

## Як чэмпіёнка краіны па кікбоксінгу і муай-тай працуе на «хуткай» і займаецца кіналогіяй

**Анастасія Калашнікава — чалавек неардынарны. Яна ніколі не займалася фізкультурай у дзяцінстве, але стала шматразовай чэмпіёнкай краіны па двух відах бокса. Дарэчы, спорт дзяўчына, нягледзячы на поспехі, не лічыць сваёй прафесіяй, яна працуе фельчарам на «хуткай». Пасля кожнай змены Насця «гатовая сысці» з любімай працы, але ў іншай сферы сябе проста не ўяўляе. Нядаўна проста ў машыне хуткай дапамогі на фельчара напаў п'яны мужчына. Дзякуючы сваім навыкам у боксе дзяўчына здолела абараніцца. Пра тое, як у адных сутках знайсці час на ўсе любімыя справы і з чым даводзіцца сутыкацца ў рабоце, Анастасія расказала ў інтэрв'ю.**

### «ХАРАКТАР ВЫЯЎЛЯЕЦЦА МЕНАВІТА Ў РЫНГУ»

Муай-тай у жыцці дзяўчыны з'явіўся пасля 20, да гэтага і намёку на спартыўны ўхіл не было. У школе Насця не хадзіла нават на фізкультуру — група ЛФК вызваляла яе ад заняткаў.

— Што такое адціскацца, скакаць, бегаць? Два крокі наперад і да пабачэння, — расказвае дзяўчына. — Сябар узяў за руку і прывёў у залу, калі я ўжо вучылася ў каледжы. Ён абгрунтаваў гэта тым, што дзяўчына павінна ўмець усё.

З-за недахопу часу спачатку Анастасія наведвала трэніроўкі вельмі рэдка, дзесьці раз на месяц.

— Я была старастай, такой зубрылкай, што ўвесь час знаходзілася на вучобе плюс яшчэ працавала. Але паступова з'явілася жаданне і магчымасць трэніравацца больш, а калі ўжо заканчвала каледж, мой першы бой супадаў якраз з дзяржэкзаменам, — успамінае Насця. — Неяк я прыйшла да трэнера і сказала, што хачу ўдзельнічаць у спаборніцтвах. Быццам бы нічога незвычайнага, ён не здзівіўся, але настаўнік тады не зразумеў (я хацела біцца ўжо на найбліжэйшых спаборніцтвах, якія былі праз месяц). Ён ведаў, што мне проста знясуць галаву, але паверыў і выставіў мяне.

Той бой Насця, вядома ж, прайграла, але прайшло менш за год, як яна стала чэмпіёнкай Беларусі па муай-тай.

— Мне хацелася зразумець, што я ўмею. Біць прыгожа мяшок? На гэта здольныя многія, характар праяўляецца менавіта на рынгу. Я прыйшла ў тайскі бокс для таго, каб выхоўваць у сабе сілу волі, а без рынга гэта немагчыма, нават калі будзеш майстрам спорту па баі з ценем.

Гераіня адзначае, што выходзіць у рынг першы раз было вельмі страшна. Да таго ж у Насці тады была траўма — разрыў сухажылля, запаленчы працэс, які ўрачы спачатку не заўважылі. Дзяўчына нават руку ў пальчатку не магла засунуць, але так хацелася выступіць, што выйшла на бой. З 2015 года Анастасія Калашнікава заўсёды была чэмпіёнкай краіны па муай-тай, прайграла «рэспубліку» толькі сёлета. У кікбоксінгу яна была другой толькі ў 2016-м, а ў астатнія гады роўнай Насці ў краіне не было.

— Мой самы вялікі поспех здарыўся якраз сёлета, хоць рэспубліку я і прайграла, мне зламалі рэбры ў трэцім раўндзе. Але я бачыла свой прагрэс у адносінах да гэтага саперніка. З той дзяўчынай я б'юся ўжо не першы раз, але ў мяне не атрымліваецца яе перамагчы. У першых нашых баях я была наогул у ролі мяшка. Сёлета, нягледзячы на другое месца, гэта была перамога над сабой, таму што я змагла правесці плённую працу і баксіраваць добра. Муай-тай для мяне, наогул, для таго, каб здзяйсняць маленькія перамогі над сабой.

Анастасія кажа, што проста заставацца ў тайскім боксе для яе ўжо перамога. Аднак апошнія пару месяцаў дзяўчына не трэніруецца, яна адзначае моцны спад у сваёй спартыўнай кар'еры.

**«Кожную раніцу ў канцы змены я звальняюся, крычу, плачу. А потым адпачнеш паўдня і думаеш, што не ўсё так дрэнна».**

— Зараз спадзяюся прывесці галаву ў парадак і вярнуцца. Пасля такога перыяду, як правіла, ідзе ўздым, калі пацярпець. Але ў той жа час 80 працэнтаў спартсменаў пасля падобных абставінаў адсейваюцца.

### «РАНЕЙ ВЫКЛІКАЎ БЫЛО МЕНШ, ЦЯПЕР МЫ ПРАКТЫЧНА НЕ ВЫЛАЗІМ З МАШЫН»

Нягледзячы на поспехі і вялікую частку жыцця, якую займае спорт, яго Насця не лічыць сваім асноўным відам дзейнасці.

— У мяне ёсць адукацыя, прафесія, праца, за якую мне плацяць грошы, — адзначае дзяўчына.

Ужо пяць гадоў яна працуе фельчарам выязной брыгады на «хуткай», выязджае да пацыентаў, аглядае іх, аказвае першую дапамогу і прымае рашэнне аб шпіталізацыі.

— На «хуткую» ўладкавалася на апошнім курсе медыцынскага каледжа, а да гэтага працавала санітарам у бальніцы хуткай дапамогі, у прыёмным аддзяленні, — расказвае Насця. — Бачыла, як брыгады прывозяць хворых, мне здавалася, яны такія класныя, людзей ратуюць, прама ратавальнікі Малібу, толькі няма чырвоных купальнікаў. Хто б мне тады сказаў, што яны ездзяць на насмарк у 4 раніцы, — усміхаецца гераіня.

Наогул, першая адукацыя Анастасіі — цырульная, так хацела мама. А перш чым паступіць у медкаледж, дзяўчына паглядзела на бальнічныя рэаліі з боку санітара.

— Усе звычайна сыходзяць пасля першай практыкі, а я, наадварот, зацвердзілася ў жаданні паступаць. Хоць відовішча ў прыёмным хуткай дапамогі не з прыемных. Калі чалавек хварэе, ён заўсёды непрыгожы, а яшчэ часта ж прывозяць п'яных і бамжоў. Іх трэба мыць, галіць, гэта таксама вошы... Санітары і студэнты рабілі гэта дзеля доступу да нейкіх працэдур, аперацыйных, каб паглядзець, як працуюць урачы. Потым я працавала ў рэанімацыі, гэта ўжо быў канкрэтны догляд хворых: памперсы, пасцелі, мыйка палат.

Усё гэта не адвярнула гераіню ад медыцыны, цяпер на «хуткай» у сярэднім за змену Насця выязджае на 20 выклікаў. Больш за ўсё ў прафесіі яна стамляецца ад іх неабгрунтаванасці.

— Раней выклікаў было менш, а цяпер мы практычна не вылазім з машын, — заўважае фельчар. — Ёсць людзі, якія ўжо ведаюць урачоў «хуткай» у твар, а я, у сваю чаргу, ведаю ўсіх іх членаў сям'і або як клічуць кошку, напрыклад. Тэмпература, баліць галава, круціць жывот — што «хуткай» там рабіць, незразумела, але выязджаем мы на ўсё.

Як правіла, усе выклікі размяркоўваюцца паміж брыгадамі, да дзяцей выязджаюць педыятры, да сардэчнікаў — кардыёлагі, да астатніх — лінейныя «хуткія», на адной з якіх і працуе Насця.

— Часта з-за велізарнай колькасці выклікаў кардыялогія не спраўляецца, таму што кожны другі выклікае «хуткую», як быццам у яго баліць сэрца. Калі спецыяльнай брыгады няма, то дыспетчар пасылае найбліжэйшую. Так, нядаўна мяне адправілі да трохмесячнага дзіцяці без прытомнасці, у той час як рэанімацыя паехала падымаць п'янага чалавека з куста, — са шкадаваннем адзначае фельчар.

### «У КРАСАВІКУ МЯНЕ ЎДАРЫЎ П'ЯНЫ ПАЦЫЕНТ»

Неабгрунтаваныя выклікі для Насці самыя складаныя таму, што ў гэты час спецыяліст «хуткай» можа дапамагчы чалавеку, які сапраўды ў гэтым мае патрэбу, альбо падрыхтавацца да наступнага выезду.

— Ніколі гэта не выказваю пацыентам, нават выгляду не падаю, але вельмі нервуюся. Ад гэтага стамляешся. Вам скажа любы з нашых калег, што калі лінейная брыгада «ловіць» інфаркт, то ў яе жаданне працаваць з'явіцца яшчэ на месяц наперад. Таму што ты дапамог, выратаваў, зрабіў усё, што мог. Хоць фізічна гэта, вядома, цяжка, і маральна — стрэс. У нашай рабоце вельмі важна хутка прыняць рашэнне. Ёсць правіла залатой гадзіны: калі ты ўпусціш час, пацыент можа атрымаць наступствы, якія складана выправіць. Наогул, першая дапамога вельмі важная, бо яе можна аказаць так, што чалавек застанецца інвалідам.

На жаль, у працы Насці даводзіцца сутыкацца і са смерцю. Дзяўчына кажа, што прывыкла і не баіцца яе, але калі ты дапусціў нейкую памылку ці зрабіў нешта не тое, то заўсёды доўга пракручваеш гэта ў галаве.

— Бывала рознае: дзіця паміралa ў мяне ў машыне, было спыненне дыхання. Гэтыя гады ў «хуткай» навучылі прасцей ставіцца да смерці. Цяжка ездзіць на канстатацыю смерці (гэта таксама наша праца), вельмі складана мець зносіны са сваякамі, забітымі горам, — расказвае Анастасія.

Работа на «хуткай» бывае яшчэ і небяспечная. Здавалася, гэта паказваюць толькі ў кіно і серыялах, але аказалася, што здараецца і ў рэальнасці.

— У красавіку мяне ўдарыў п'яны пацыент прама ў машыне хуткай дапамогі. Ён устаў і пачаў выбіваць заднія дзверы, я ўгаворвала яго сесці, таму што разумела, што ён зараз упадзе і яшчэ больш разаб'е сабе галаву. Я пачала прыўздымацца, каб спыніць яго, але мужчына развярнуўся і ўдарыў мне кулаком у твар. Дзякуючы таму, што займаюся спортам, здолела ўхіліцца. Была сапраўдная бойка, мы неяк прыціснулі яго да кушэткі. Тым не менш я атрымала страсенне мазгоў. Напарніца так спалохалася, што ўціснулася ў сценку і яшчэ паўгадзіны не магла размаўляць. Для мяне было прынцыпова, каб мужчыну пакаралі, гісторыя з міліцыяй працягваецца яшчэ і цяпер. Ведаеце, калі б я не займалася боксам, усё магло б скончыцца па-іншаму.

У цэлым Насця адзначае, што ўрачы «хуткай» рэдка атрымліваюць падзяку, але яе і не чакаюць, а проста робяць сваю справу.

— Бываюць і ўдзячныя пацыенты, але вельмі рэдка. Звычайна нас не ўспамінаюць, могуць дзякаваць урачам у аддзяленні, а мы — так, недзе збоку. Гэта зразумела, звычайна мы ні з чым добрым і не асацыіруемся, таму што людзі выклікаюць «хуткую», калі ім дрэнна.

**«Я прыйшла ў тайскі бокс для таго, каб выхоўваць у сабе сілу волі, а без рынга гэта немагчыма, нават калі будзеш майстрам спорту па баі з ценем».**

Што б ні казала Насця пра сваю працу, робіць яна яе з любоўю, дадаючы:

— Калі б была магчымасць нешта ў жыцці змяніць, я набралася б смеласці і пайшла ў медыцынскі ўніверсітэт. І нават нягледзячы на нашу неідэальную сістэму аховы здароўя, я тут засталася б. Напэўна, з-за гэтага я ў жыцці і тармажу, разумею, што трэба нешта мяняць, магчыма, сыходзіць з «хуткай», але больш нідзе сябе не бачу. Напэўна, калі б за маю працу плацілі добра, то я ездзіла б на выезды ўсё жыццё.

Акрамя спорту і працы на «хуткай», Насця вучыцца ў БДПУ на сурдапедагога. Пакуль з-за недахопу часу і сродкаў дзяўчына ўзяла «акадэмку», але абавязкова плануе вярнуцца. Акрамя таго, нядаўна ў Анастасіі з'явіўся яшчэ адзін занятак — кіналогія.

— Раблю гэта больш для сабакі. У дзяцінстве са мной 11 гадоў жыў сабака, а цяпер ужо самой захацелася завесці жывёлу, гэта падштурхнула да курсаў. Вырашыла, што пайду, павучуся, думала, што з часам гэта жаданне адпадзе, але — не. Скончыла першы курс, на сярэдзіне другога ў прытулку на Гурскага ўбачыла шчанюка і забрала сабе. Хоць гэтага і не планавала.

На заканчэнне задаю Анастасіі пытанне: «Адкуль жа ў маладой дзяўчыны столькі сіл?»

— Гэта ўсё канцэнтрацыя любімых спраў. Кожную раніцу ў канцы змены я звальняюся, крычу, плачу. А потым адпачнеш паўдня і думаеш, што не ўсё так дрэнна.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

На слыху

# КАЛІ ЧАКАЦЬ ГРЫП?

## У краіне пачалася масавая вакцынацыя

**Сёлета супраць віруса грыпу плануецца прышчапіць каля 3,7 мільёна беларусаў. Кампанія вакцынацыі ў нашай краіне пачалася з кастрычніка.**

### Каму і дзе варта прышчапляцца?

Атрымаць бясплатную прышчэпку супраць грыпу могуць усе ахвотныя ў паліклініцы па месцы жыхарства. Абавязкова гэта зрабіць медыкі рэкамендуюць так званым групам рызыкі.

— Пад'ём захваральнасці вострымі рэспіраторнымі захворваннямі, у тым ліку і грыпам, у нас пачынаецца звычайна на 40-м тыдні бягучага года і заканчваецца на 20-м тыдні наступнага года — гэта пачатак мая. Таму з 1 кастрычніка мы пачынаем масавую кампанію вакцынацыі супраць грыпу, — расказала **намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.** — Кампанія будзе праводзіцца ў тых жа межах, што і летась — прышчапіць плануецца 40,5 % насельніцтва. Да груп высокай рызыкі адносяцца дзеці ад 6 месяцаў, дарослыя з хранічнымі захворваннямі, пажылыя людзі ад 65 гадоў, асобы з імунасупрэсіяй (прыгнечаннем імунітэту з тых ці іншых прычын), цяжарныя жанчыны, а таксама групы высокай рызыкі заражэння грыпам — дзеці ад 3 да 6 гадоў, школьнікі, медыцынскія работнікі, асобы з установ з кругласутачным знаходжаннем, работнікі сферы бытавога абслугоўвання і ўстаноў адукацыі, гандлю, грамадскага харчавання, транспарту, тыя, хто знаходзіцца ў кантакце з асобамі з імунасупрэсіяй і з дзецьмі да 6 месяцаў.

Бясплатная прышчэпка робіцца з выкарыстаннем трохвалентнай расійскай вакцыны «Грыпол Плюс», якая ўжо закуплена ў дастатковай колькасці. Пры жаданні на платнай аснове робяцца прышчэпкі трохвалентнымі вакцынамі «Ваксігрып» (Францыя), «Інфлювак» (Нідэрланды) і чатырохвалентнай «Ваксігрып Тэтра». Трохвалентныя вакцыны каштуюць 15—20 рублёў, чатырохвалентная — 25. Высокаспецыфічны імунітэт фарміруецца праз 7—14 дзён пасля прышчэпкі і захоўваецца на працягу 6—12 месяцаў.

### Трохвалентная або чатырохвалентая?

Як расказала **кіраўнік нацыянальнага цэнтра па грыпе РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Наталля ГРЫБКОВА**, мінулагодні сезон грыпу ў нашай краіне працякаў гэтак жа, як і ў іншых краінах еўрапейскага рэгіёна. У першай яго палове пераважаў вірус А (H1N1), у другой палове сезона дамінавалі вірусы групы В.

— Мы ўсе прызвычаіліся апасацца вірусаў тыпу А, у той жа час вірусы групы В вельмі небяспечныя для дзяцей і пажылых людзей, — адзначыла Наталля Грыбкова. — У мінулым сезоне вялікая частка ўскладненняў была абумоўлена менавіта вірусамі групы В. Яны падзяляюцца на дзве лініі — Victoria і Yamagata. І калі раней цыркулявалі вірусы адной з гэтых ліній, то з 2003 года мы назіраем іх адначасовае распаўсюджанне. Летась у 90 % выпадкаў мы выяўлялі вірусы лініі Yamagata. Але ў канцы сезона з'явіўся зменены дрэйфавы варыянт Victoria, супраць якога ў чалавека пакуль няма імунітэту. Таму прышчапляцца мэтазгодна кожны год, і пажадана, каб вакцына была чатырохвалентная. У варыянт сёлетняй чатырохвалентай вакцыны ўнесены штамы гэтага новага дрэйфавага віруса.

### Чаму варта прышчапляцца пажылым людзям і дзецям?

— Грып — тое захворванне, ад якога не атрымаецца адмахнуцца. Ён выклікае не толькі захворванні верхніх і ніжніх дыхальных шляхоў, але і шматлікія ўскладненні, якія асабліва небяспечныя ў сталым узросце, — падкрэсліў **галоўны пазаштатны інфекцыяніст Міністэрства аховы здароўя, загадчык кафедры інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Ігар КАРПАЎ.** — Найперш гэта абвастрэнні ішэмічнай хваробы сэрца, бранхіяльнай астмы, хранічнай абструктыўнай хваробы лёгкіх, дэкампенсацыя цукровага дыябету. Жыць з гэтымі хваробамі і без таго няпроста, а калі такі пацыент захварэў на грып, давядзецца прымаць сур'ёзныя меры. Акрамя таго, у сталых людзей, якія перанеслі грып, з-за перыяду вымушанага пасцельнага рэжыму значна зніжаюцца іх фізічныя магчымасці.

У дзяцей таксама грып часта не праходзіць бясследна і павышаецца рызыка ўскладненняў. Як расказаў **дацэнт кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Мікалай ГАЛАБАРОДЗЬКА**, у дзіцяці, якое перанесла грып, нашмат павышаецца рызыка захварэць на пнеўмакокавую пнеўманію і атыт.

— Той надрыўны кашаль, які здараецца падчас грыпу, сведчыць, што ў трахеі цалкам знішчана эпітэліяльная высцілка. Нашы дыхальныя шляхі перастаюць выконваць функцыю бар'ера і адкрыты для розных інфекцый, — расказаў Мікалай Галабародзька.

### Чым лячыць?

Як адзначыў Ігар Карпаў, у Беларусі ёсць два сродкі, якія прызначаюцца пры лячэнні ад грыпу. Гэта асельтамівір і занамівір. Ёсць і айчынны іх аналаг — флюстоп. Да такой тэрапіі абавязкова варта дадаваць частае піццё, пры высокай тэмпературы — гарачкапаніжальныя сродкі.

— Самае частае пытанне, якое задаюць пра грып, — «Што рабіць, каб не прышчапляцца і не захварэць?». Няма такіх сродкаў! Народныя метады накшталт часнаку, а таксама імунамадулюючая тэрапія не з'яўляюцца супрацьгрыпознымі. Таму вакцынацыя — пакуль самы надзейны сродак.

### Як змагаюцца з ім за мяжой?

У некаторых краінах прышчэпку ад грыпу можна набыць пасля прыбыцця ў аэрапорт. У ЗША яна прадаецца ў некаторых магазінах і каштуе каля 20 долараў. Вакцынацыя там лічыцца эфектыўным і бяспечным сродкам.

Больш шырока праводзіць яе ў Беларусі было вырашана пасля пандэміі грыпу 2009—2010 гадоў. І апошнім часам яна ахоплівае 40 % насельніцтва. Летась гэта дазволіла, паводле інфармацыі Іны Карабан, папярэдзіць 135 тысяч выпадкаў грыпу, у тым ліку больш за 16 тысяч ускладненых формаў. Такой колькасці прышчэпленых дастаткова, каб сфарміраваць калектыўны імунітэт па грыпу.

— Грып не з'яўляецца настолькі заразнай інфекцыяй, як адзёр ці дыфтэрыя, — тлумачыць Мікалай Галабародзька. — Калі адзін хворы на адзёр заражае 15—20 кантактных асоб, то хворы на грып — 1—3 чалавек. Таму, калі для фарміравання калектыўнага імунітэту супраць адру неабходна 95 % прышчэпленага насельніцтва, дыфтэрыі — 85 %, то па грыпе гэта лічба складае 30—70 %. Мы пакуль спыніліся на лічбе ў 40 %, і гэта дае свой эфект.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Медыцынскі цэнтр для навакольля

**У Ваўкавыску адкрылі новы лячэбны корпус, дзе будуць абслугоўвацца жыхары і суседніх раёнаў**

**У будучым тут плануецца арганізаваць уралагічнае, хірургічнае, тэрапеўтычнае міжраённыя аддзяленні для Свіслацкага, Бераставіцкага, Зэльвенскага, Мастоўскага раёнаў. З уводам у эксплуатацыю новага корпуса завершыцца фарміраванне медыцынскага цэнтра для жыхароў Ваўкавыскага і суседніх з ім раёнаў.**

Фота БелТА.

Аб гэтым заявіў падчас адкрыцця лячэбнага корпуса **старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Уладзімір КРАЎЦОЎ.** Ён выказаў падзяку ўсім, хто паспрыяў уводу важнага лячэбнага аб'екта, дзе будуць спалучацца высокатэхналагічныя метады лячэння і камфорт.

Галоўны ўрач Ваўкавыскай раённай бальніцы Алена Грыцкевіч правяла экскурсію па лячэбным корпусе, дзе размешчаны прыёмнае, дыягнастычнае, тэрапеўтычнае, траўматалагічнае, неўралагічнае і кардыялагічнае аддзяленні. Асаблівае значэнне тут надаюць аперацыйнаму блоку, аддзяленням рэанімацыі і анестэзіялогіі.

На абсталяванне для хірургічнага аддзялення (у тым ліку рэнтгеналагічныя і наркознадыхальныя апараты, апарат ультрагукавой дыягностыкі) Міністэрствам аховы здароўя накіравана два мільёны рублёў, мільён выдзелены з абласнога бюджэту. Раённыя ўлады паклапаціліся аб набыцці аргтэхнікі і мэблі для медыцынскага аб'екта.

Новыя карпусы ўзведзены непадалёку ад старой бальніцы, дзе ў свой час месціўся пагранічны атрад. Калі яму знайшлі іншае месца, ваенны гарадок аддалі пад лячэбны аб'ект. Але з цягам часу нагрузка на аддзяленні ўзрасла і з'явілася неабходнасць будаўніцтва новай бальніцы, якая б адпавядала сучаснаму медыцынскаму абслугоўванню, а таксама санітарным і супрацьпажарным нормам. Такім чынам пры садзейнічанні абласных уладаў было прынята рашэнне пабудаваць новы лячэбны корпус на 260 месцаў.

— Налета будзем здаваць у эксплуатацыю Астравецкую цэнтральную раённую бальніцу, якая таксама будзе мець міжрэгіянальнае значэнне, — адзначыў Уладзімір Краўцоў. — У зону абслугоўвання трапяць усе паўночныя раёны Гродзенскай вобласці, а таксама некаторыя раёны Міншчыны.

Развіцце міжрэгіянальных цэнтраў — адзін з важных рэгіёнаў у аказанні медыцынскіх паслуг. Такая лінія зададзена і кіраўніцтвам галіны.

— Міністэрства ініцыіруе развіцце міжрэгіянальных цэнтраў. Гэта дасць магчымасць канцэнтраваць высокапрафесійныя кадры і высокатэхналагічнае абсталяванне, аказваць дапамогу большаму колу насельніцтва, — падкрэсліў **міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Валерый МАЛАШКА.** — Акрамя эканамічнай мэтазгоднасці, ёсць шэраг іншых плюсоў. Пацыентам не прыйдзецца ездзіць далёка, яны змогуць атрымаць медыцынскую дапамогу на месцы.

У адміністрацыі раённай бальніцы спадзяюцца, што новая ўстанова дазволіць затрымаць на рабочым месцы маладых спецыялістаў, якія прыязджаюць сюды па накіраванні. З уводам новага корпуса будзе створана 42 новыя рабочыя месцы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Пісьмо ў рэдакцыю

# ЧАМУ Я АПЕРЫРАВАЛАСЯ Ў МІНСКУ

**12 верасня ў «Звяздзе» быў надрукаваны артыкул «Ахвяруйце, людзі добрыя, на лячэнне дзіцяці», у якім гаворка ішла пра людзей з працягнутай рукой, што збіраюць, альбо кажуць, што збіраюць грошы на лячэнне ці аперацыю за мяжой. Адна з нашых чытачак, Алена Ерашэўская, у адказ на гэтую публікацыю даслала нам электронны ліст, у якім падзялілася гісторыяй свайго лячэння.**

«Калі людзі збіраюць грошы на аперацыю за мяжой... Разумею, што калі гаворка заходзіць пра здароўе, а тым больш пра жыццё, мы гатовыя аддаць апошняе, каб нам, альбо нашаму дзіцяці ці блізкаму чалавеку дапамаглі. Вядома, выпадкі бываюць розныя, і раз на раз не прыходзіцца, але часам мы спадзяёмся на замежжа, у той час як і ў нас праводзяцца тыя ж самыя аперацыі. Таму заўсёды трэба вельмі добра ўсё ўзважыць, прымаючы рашэнне.

Ведаеце, наша медыцына — не самая дрэнная ў свеце. У мяне была сітуацыя, калі мне патрэбна была складаная і тэрміновая аперацыя. І я баялася рабіць яе тут, у Беларусі, і хацела аперыравацца за мяжой. Я напісала ліст у Міністэрства аховы здароўя і мне адтуль прыслалі адказ, прычым вельмі дэталёвы. У ім былі пералічаныя сусветныя клінікі, якія робяць такія аперацыі, і напісана, што ў нас яны таксама праводзяцца, і што наш пратакол вядзення аперацыі не адрозніваецца ад прызнаных у свеце.

Але я ўсё ж вырашыла паспрабаваць шчасця за мяжой і паехала ў Маскву (гэта была самая даступная клініка для мяне). Там на кансультацыі мне агучылі кошт аперацыі — гэта была цана маёй кватэры. Мне стала не па сабе, і я сказала, што падумаю. Выйшла на калідор, дзе мяне чакаў муж... Ён сказаў, што калі я прыму такое рашэнне, то ён згодны на продаж кватэры.

Пагадзілася на аперацыю. Мне сталі падрабязна расказваць пратакол лячэння і ў тым ліку сказалі, што выпішуць на пяты дзень. Аперацыя, паўтаруся, складаная і вельмі траўматычная, і я ўжо тады засумнявалася, як гэта я на пяты дзень змагу даехаць дадому, у Мінск, хоць доктар і запэўніваў мяне, што гэта магчыма.

...У рэшце рэшт атрымалася так, што аперыравалася я ўсё ж такі ў Мінску, і пасля аперацыі ў мяне паўгода быў пасцельны рэжым. З жахам думала: як бы гэта я ехала дадому з Масквы на пяты дзень? Таму што пасля той аперацыі пры кожным глыбокім удыху ці чханні мае разрэзаныя рэбры заскоквалі адно за другое, і гэта было вельмі балюча...

І я зразумела, што гэтым замежным дактарам абсалютна ўсё роўна, як вы сябе будзеце адчуваць пасля. Так, яны зробяць сваю работу, і калі вы належныя дзве гадзіны пасля аперацыі пражылі — значыць, аперацыя прайшла ўдала. А як вы далей будзеце праходзіць рэабілітацыю ў сябе дома, доктара ўжо не хвалюе... Ён дасць вам эпікрыз, і далей вы ўсё роўна будзеце лячыцца дома. Але нашы дактары пры гэтым не будуць ведаць ні пратакола, па якім вам рабілі аперацыю, ні таго, якія лекі пры гэтым выкарыстоўваліся. І гэта можа не самым лепшым чынам адбіцца на далейшым ходзе лячэння...»

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

Справа жыцця

# СЛУХАЦЬ МУЗЫКУ ДУШЫ

## Адзіны ў краіне майстар балалаек і домраў пра сустрэчу з Прэзідэнтам, рыбалку і «Deep Purple»

**У прасторнай зале комплексу «Рамонак» халаднавата, але не ад гэтага дрыжыкі ў пінскага майстра музычных інструментаў Руслана МАКАРЭВІЧА. Ён трохі хвалюецца, і не дзіўна — не кожны ж дзень бывае сустрэча з Прэзідэнтам! Калі кіраўніцтва каледжа, дзе ён працуе, абвясціла аб запрашэнні на выстаўку для кіраўніка дзяржавы, не паверыў: «Жартуеце?»**

**І вось, пазнаёміўшыся з Русланам менавіта падчас гэтай сустрэчы, я накіравалася ў яго родны Пінск, каб больш даведацца пра справу яго жыцця.**

### Балалаечны драйв

Хлопчыкам Руслан Алегавіч наведваў музыкальную школу. Трапіў у аркестр народных інструментаў, дзе яму даручылі балалайку: «І вось не паверыце, калі пачаў іграць, адчуў, як цяпер кажуць, драйв».

А потым прыйшла любоў (і не толькі да музыкі). Пасля школы Руслан Макарэвіч паступіў у Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (цяпер БДАТУ). Там іграў у аркестры, якім кіравала студэнтка кансерваторыі Аксана. У будучым гэтая дзяўчына стала жонкай Руслана Алегавіча.

— У Аксаны была балалайка ручной работы вядомага расійскага майстра. Калі ўзнікалі паломкі, трэба было ехаць у Маскву да гэтага спецыяліста. Задаўся пытаннем, чаму ў нас няма прафесіяналаў таго ж узроўню? У той час я ўжо быў інжынерам, нават аспірантуру скончыў. Падумаў: няўжо не змагу разабрацца, — успамінае майстар.

Пачаў шукаць літаратуру — знайшоў у Ленінскай бібліятэцы некалькі матэрыялаў у часопісах. У яго рабочым кабінеце і сёння заўсёды пад рукой артыкул савецкага авіяканструктара Марка Купфера «Слова пра балалайку» з часопіса «Наука и жизнь» 1986 года:

— Там сцісла напісана ўсё, пра што я хацеў даведацца. Аўтар сам рэстаўраваў старажытныя балалайкі. Гэта было яго хобі. Таксама Купфер замаляваў, як што ўстроена. Па сутнасці, ён правёў велізарную даследчую работу і стварыў зборны вобраз балалайкі, якую назваў «Масквічка». Гэты інструмент пакладзены ў аснову маіх вырабаў.

Праз знаёмых музыкантаў Руслан Макарэвіч знайшоў тэлефон аўтара і напрасіўся на сустрэчу, якая паклала старт яго працы. Майстэрняй была кухня. Першы інструмент зрабіў у 1992 годзе. Працаваў над ім цэлы год. Па прыкладных падліках за гэты час Руслан Макарэвіч адрамантаваў і стварыў ужо 60 домраў і балалаек:

— Рабіў два-тры інструменты ў год. Больш не заказвалі. Многія не ведалі, што дзесьці ў Пінску ёсць дзівак, які робіць балалайкі.

### Сакрэты майстэрства

Самы складаны этап у рабоце над музычнымі інструментамі — падабраць матэрыял. У выпадку балалайкі — дрэва. Традыцыйнымі былі клён, елка, кедр.

— А мне падабаецца дрэва падук. Пастукаў па яловай дошчачцы — нядрэнны гук, пастукаў па палісандры — таксама цікавы. Спрабаваў арэх, ясень. Калі пастукаў па падуку, вырашыў, што з яго трэба рабіць корпус. На мой погляд, з гэтага матэрыялу атрымліваюцца выдатныя інструменты, — дзеліцца таленавіты пінчук.

За экзатычнай драўнінай часам прыходзіцца ездзіць і за мяжу. Найлепшы матэрыял для інструментаў з дрэў, якія растуць павольна, на поўначы ці ў гарах.

Але галоўная асаблівасць гэтага этапу ў тым, што драўніна пойдзе ў справу не адразу. Парэзаная на тонкія дошчачкі, яна павінна «вытрымацца» мінімум пяць-шэсць гадоў, а то і ўсе 10—12:

— Гэта падобна да справы віна-робаў. Вядомыя вытворцы бочкі з напоямі закопваюць. І чым больш віно захоўваецца, тым лепшай яно якасці. Тое ж самае і з дрэвам. Ад некаторых майстроў я чуў, што запасы драўніны засталіся ў іх у спадчыну — з вытрымкай 50 гадоў. У мяне, вядома, такіх магчымасцяў не было, 10—12 гадоў — ужо добра. Але ёсць матэрыял, які захоўваецца амаль чвэрць стагоддзя.

Балалайка складаецца прыкладна са 100 дэталяў. Асноўныя элементы, акрамя струн, — гэта корпус, грыф (ручка) і дэка (плоская частка корпуса), якая фарміруе гук. Для дэкі выдатна падыходзіць матэрыял венге, палісандр. Свае хітрыкі ёсць у кожнага элемента балалайкі. Напрыклад, грыф бывае склеены з некалькіх частак. Унутры змяшчаецца спецыяльная сцяжка — анкерны болт, які не дае гнуцца ручцы пад нацяжэннем струн.

Руслан Алегавіч стварае інструменты для прафесіяналаў і вучняў музычных устаноў адукацыі. На адну балалайку акрамя драўніны ідуць кілаграмы цярпення, метры стараннасці, частка душы аўтара і... 30 дзён. Ацэньвае майстар карпатлівую ручную працу над прафесійным інструментам у 2000 беларускіх рублёў. Балалайкі прасцейшыя, з таннейшых матэрыялаў (але не з меншай любоўю) каштуюць у два разы менш. Попыт на індывідуальныя балалайкі і домры ў Руслана Макарэвіча невялікі. Больш запатрабаваны рамонт інструментаў.

— Раней, калі быў маладзейшы, ездзіў па музычных школах, прэзентаваў свае інструменты. Цяпер нідзе рэкламу не даю, але музыканты мяне ведаюць, — адзначае майстар і расказвае аб прынцыпе сарафаннага радыё. — Выканаўцы сустракаюцца на конкурсах. Пытаюцца, у каго чый інструмент? Так і даведваюцца, што ў Пінску ёсць такі майстар. Дапамагаюць і сацыяльныя сеткі. Хтосьці выкладвае там кацянят, фота з паездак, паходаў на шашлыкі, а я — свае музычныя інструменты.

### «За табой — школа»

Індывідуальны прадпрымальнік супрацоўнічае з аддзеламі культуры выканкамаў Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай абласцей. Таму, калі ўзнікла неабходнасць прадставіць напрацоўкі, звярнуліся да Руслана Алегавіча. Ён адразу згадзіўся правесці прэзентацыю. Прайшоў час і прапанову ўдакладнілі — выстаўка з удзелам Прэзідэнта.

Сустрэча прайшла плённа. Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў працу Руслана Макарэвіча, даручыў дапамагчы майстру і адзначыў: «За табой — школа. Пакуль ты адзін, але ў цябе павінна быць больш памочнікаў». Гэтым зараз і заклапочаны Руслан Алегавіч. Адзіны дарадца пакуль толькі сябра, гітарны майстар.

Пытаюся: «Дзе будзеце шукаць змену?»

Руслан МАКАРЭВІЧ са сваімі вырабамі.

— Задача няпростая, але ідэі ёсць. Я працую выкладчыкам у Пінскім індустрыяльна-педагагічным каледжы. У нас ёсць кірунак па падрыхтоўцы спецыялістаў дрэваапрацоўкі. Там даюць асновы, якія неабходныя для маёй работы, — мяркуе Руслан Алегавіч. — Мне застаецца знайсці некалькі студэнтаў, якім будзе цікава ствараць музычныя інструменты.

І гэта асноўнае патрабаванне да вучняў. Але не абысціся, як кажа майстар, без звычайнай чалавечнасці і любові да музыкі. Менавіта яны дапамогуць разгледзець аднадумцаў.

— Аднойчы на перапынку заўважыў хлопца ў навушніках. Пацікавіўся, што слухае? Аказалася, яму падабаецца тая музыка, што і мне 10—15 гадоў таму. Я прыгледзеўся да яго больш уважліва, аказаўся вельмі цікавым чалавекам і майстрам на ўсе рукі — і з электронікай, і з электрыкай спраўляецца. На музыку, танцы ходзіць. Такіх людзей мне трэба шукаць.

— Прэзідэнт адзначыў, што за вамі школа. Адчуваеце значнасць сваёй працы?

— Такія высокія словы да мяне ў галаву яшчэ не прыходзілі. Так, я адзін з першых, хто ў нашай краіне пачаў майстраваць балалайкі і домры. Быў прыемна здзіўлены, што на маю дзейнасць звярнулі ўвагу. Гэта прызнанне маіх сціплых заслуг. Было складана: выхоўваў дваіх дзяцей, працаваў, але заўсёды знаходзіў час для сваёй справы.

У год майстар можа вырабіць да 20 домраў і балалаек. Каб стварыць больш, трэба аснашчэнне, плошчы. Даручэнне дапамагчы з гэтым прагучала ад Прэзідэнта.

— З плошчай хутка вырашыцца пытанне. Пра майстэрню сваю мы з таварышам ужо размаўлялі. Важна, каб там можна было захоўваць інструменты для рамонту. Патрэбны абсталяванне і памяшканне для пыльнай работы, дзе будзем піляваць, габляваць, пакой для зборкі, афарбоўкі інструментаў. Трэба кантраляваць тэмпературу, вільготнасць у майстэрні — яны ўплываюць на якасці вырабаў, — расказвае Руслан Алегавіч.

На першым этапе майстры плануюць павялічыць вытворчасць да 30 інструментаў. Калі з'явяцца ўмовы, выйдуць і на 50, калі будзе попыт.

Асаблівасць кожнага інструмента ў тым, што свае магчымасці і непаўторнае гучанне ён атрымлівае толькі праз час. Балалайка таксама не адразу «раскрываецца».

— Інструмент лепш пачынае гучаць, калі яго абыграюць. Каб дрэва «зайграла», спатрэбіцца ад шасці месяцаў да года. Вельмі небяспечна выносіць інструмент у такі час на вуліцу, з-за перападаў тэмпературы. Калі пастаяць на прыпынку ў чаканні аўтобуса, унутры вырабу можа з'явіцца вільгаць.

— А як дзецям іх у музычную школу насіць?

— Гэта звычайная праблема для музыкантаў. Таму інструменты і патрабуюць тэхнічнага абслугоўвання, рамонту.

### Два Макарэвічы

Таленавіты чалавек — таленавіты ва ўсім. Руслан Макарэвіч — пацвярджэнне выслоўя. Ён заўзяты рыбак і чалавек з музычным густам.

Сярод любімых выканаўцаў — класікі рока «Smokie», «The Beatles», «Led Zeppelin».

— У савецкія часы іх запісы даставаліся з вялікай цяжкасцю. Я працаваў інжынерам, мой заробак быў 113 рублёў. Фірмовыя пласцінкі з замежжа каштавалі ад 25 да 40 рублёў, таму дазволіць іх сабе маглі нямногія. Але ў той час ужо з'явіліся магнітафоны і можна было перапісваць касеты. Калі ўпершыню пачуў «Deep Purple», у мяне быў шок! Такая непадобная музыка чапляла. Адзначу альбом 1971 года «Deep Purple in Rock» — віртуознае сола на гітары і вакал. Ад любімай кампазіцыі «Child in Time» — мурашкі па спіне беглі, — настальгіруе Руслан Алегавіч.

І канешне, 1980-я гады, як без «Машины времени»!

— Памятаю, як паехалі на бульбу, хлопцы ўздыхалі: «Якая песня «Свечка»! Давай паслухаем». Пытаю: «А хто там іграе?» Адказ: «Андрэй Макарэвіч!» Не можа быць! А калі я фотаздымак убачыў — ледзь са смеху не зваліўся. У мяне, першакурсніка, была такая ж прычоска! І падобныя мы, як дзве кроплі вады. Падумаў, што гэта нейкі знак, — успамінае майстар.

На погляд Руслана Макарэвіча, гэтыя песні — на стагоддзі: «А цяпер моладзь спажывае «музычны фастфуд».

Яшчэ адно хобі — рыбалка. Руслан Макарэвіч з дзяцінства самастойна майстраваў вудачкі і блешні. Асалода такога адпачынку не толькі налавіць рыбы, але і палюбавацца краявідамі.

— На Палессі шмат рэк і азёр. Гэта мая малая радзіма. Я тут вырас. Немагчыма нарадзіцца ў такім месцы і не любіць прыроду.

Руслан Макарэвіч прызнаецца, што музыка не проста яму падабаецца, а патрэбна кожны дзень, гэта яго духоўны хлеб. І да таго ж — справа ўсяго жыцця.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Не прапусціце!

# РАДЗІННАЕ. ТОЕ, ШТО ЗАЎЖДЫ ПОБАЧ

Вядома, што ўсё новае — гэта добра забытае старое. Але ёсць выключэнні з гэтага распаўсюджанага правіла. Ёсць старое, якое не становіцца новым, але застаецца актуальным, бо ніколі не забываецца, захоўваецца калі не ў нашай памяці, дык у падсвядомасці дакладна. Напрыклад, народныя звычаі і традыцыі — тое, што нашы продкі на працягу стагоддзяў пражылі, вызначылі на ўласным досведзе як галоўнае і жыццёва важнае. Тое, адгалоскі чаго мы і сёння бачым, чуем, адчуваем, разумеючы нейкім шостым пачуццём, што яно нам, дзецям веку гаджэтаў і марсаходаў, таксама вельмі патрэбнае, каб быць у гармоніі з навакольным светам і самім сабой. Мы ўжо не ведаем глыбінных сэнсаў нейкіх дзеянняў, але ж імкнёмся ўсё зрабіць правільна, каб гэту гармонію не парушыць.

На працягу многіх гадоў разабрацца ў сутнасці народных звычаяў чытачам «Звязды» дапамагалі даследчыкі народнай культуры Аксана Катовіч і Янка Крук. Рубрыка «Радзіннае», якую яны вялі, была своеасаблівай энцыклапедыяй, дапаможнікам і для тых, хто верыць у сілу народных звычаяў і абрадаў, і для тых, хто проста цікавіцца гэтай багатай спадчынай і хоча ведаць пра яе больш... Ідэя аднавіць гэту рубрыку на старонках газеты з'яўлялася ўсякі раз пасля сустрэчы з падпісчыкамі: людзі ў розных куточках Беларусі з удзячнасцю яе згадвалі і прасілі працягнуць.

А днямі згадка пра «Радзіннае» прыйшла з італьянскага Турына. Там на фестывалі традыцыйнай ежы ўдзельнічала і даволі прадстаўнічая беларуская дэлегацыя. Дык вось, гэтыя людзі з розных рэгіёнаў нашай краіны, якія рупяцца аб захаванні нацыянальнай кухні і культуры харчавання, сабраўшыся разам падчас фестывалю ў далёкай Італіі, ведаеце, пра што гаварылі? Пра рубрыку «Радзіннае», якую калісьці чыталі ў «Звяздзе»!

Даведаўшыся пра гэта, мы цвёрда вырашылі: «Радзіннаму» на старонках «Звязды» быць. З аўтарамі рубрыкі мы зараз абмяркоўваем яе новы фармат. Адзінае можна сказаць дакладна: назву пакідаем тую ж. Бо гэта якраз той выпадак, калі новае — гэта не забытае і заўжды актуальнае старое.

А публікацыі з'явяцца ў хуткім часе. Сачыце за газетай — будзе цікава!

# Асаблівасці нарыхтовак: а па капусту —

**ЦІКАВА, але факт: на традыцыйных кірмашах у розных рэгіёнах краіны розныя густы. Зразумела, у цэнтры ўвагі пакупнікоў звычайны набор «бульба—капуста—цыбуля», але не толькі па агародніну імкнуцца трапіць на сезонны кірмаш. Тут можна набыць смачную жывую рыбку, якую вытворцы вырошчвалі цэлае лета, духмяны мёд і саджанцы дрэваў і ягадных кустоў. Як мы высветлілі, у мінулыя выхадныя, напрыклад, жывая рыба не вельмі прываблівала пакупнікоў у Гродне, а вось у Віцебску, наадварот, карысталася вялікім попытам! А яшчэ мы даведаліся, што самую танную бульбу можна было купіць у сталіцы і Магілёве, у Барысаве выгадней было купляць моркву, буракі, рыбу і мёд, капусту — у Гродне, цыбулю — у Брэсце, а па памідоры трэба ехаць у Гомель. Карацей кажучы, увесь агляд сезонных коштаў мы падрыхтавалі для вас у зручным выглядзе: з табліцы вы даведаецеся аб мінімальных і максімальных цэнах, што мы сустрэлі на кірмашах, а ў інфаграфіцы — дзе мы знайшлі для вас прадукты па самых прывабных цэнах.**

Фота БелТА.

## Гродна

### Восеньскія прысмакі з «Паўднёвага»

**Традыцыйную для беларусаў агародніну прывезла на кірмаш Аксана з Мастоўскага раёна.**

Яна адзначыла, што ў сезон нарыхтовак добра ідзе бульба і цыбуля. У Аксаны агародніна запакавана па 5 і 10 кілаграмаў, але можна купіць і меншы аб'ём. Многія цікавіліся часнаком, за які жанчына прасіла 4 рублі. Бралі яго па некалькі штук.

Калгасную прадукцыю з ААТ «Васілішкі» Шчучынскага раёна раскупілі бадай што на вачах. Мабыць, таму, што кошт яе быў ніжэйшы на 10—20 капеек. Літаральна за лічаныя хвіліны «пайшлі» цыбуля, капуста, морква, і асабліва бульба. «Другі хлеб» прадалі па 25 капеек за кілаграм яшчэ зранку. Капусту бралі адразу па 10 кг.

З мясцовымі гандлярамі суседнічалі і прыезджыя. У мужчыны з Брэсцкай вобласці нядрэнна куплялі баклажаны па 1,80 і адборныя перцы па 2 рублі. А вось памідоры былі толькі ў аднаго гандляра па 1,30, але попытам амаль не карысталіся. З Брэсцкага рыбгаса «Палессе» прывезлі карасёў, амураў і карпаў. Хоць рыбы больш не было, але і ажыятажу вакол яе таксама. Жанчына-прадавец паскардзілася, што гандаль ідзе марудна. А вось каля мяснога павільёна чарга не знікала. Свіныя тушы рассякалі на месцы і прадавалі па 5,25 рубля за кіло. Людзі адразу бралі па пяць—восем кілаграмаў.

Мёд можна было купіць за 8 і 11 рублёў. Гандляры з Ваўкавыскага раёна запэўнілі, што гэта яшчэ леташняя цана, а сам мёд — новага сезона. Па іх словах, сёлета салодкага прадукту атрымалі менш. І тут галоўнае не купіць прывазны фальсіфікат, які прадаюць танней. Сапраўдны мёд, кажуць яны, «павінен драць горла».

Многія наведвальнікі засталіся задаволеныя кірмашом. Гродзенцы Інна і Андрэй паведамілі, што закупілі амаль усё, што хацелі, — цыбулю, моркву, бульбу, капусту. Не знайшлі толькі журавін. І сапраўды, гэтых ягад на кірмашы не было, хоць сёлета яна на балотах добра ўрадзіла.

## Гомель

### Стартавалі традыцыйныя кірмашы

**Калі запасаў з уласных агародаці дачы не хопіць на зіму, варта выйсці і дакупіць усё, што зараз аддаюць па вельмі прывабных цэнах.**

Удзел у кірмашах у вобласці актыўна прымаюць сельскагаспадарчыя арганізацыі, фермерскія гаспадаркі, прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі і перапрацоўчай галіны, гандлёвыя арганізацыі мяса-малочнай прадукцыі, рыбныя гаспадаркі. Яны прапануюць пакупнікам свежую агародніну, садавіну, ягады, грыбы, саджанцы дрэў і шмат чаго яшчэ. На многіх пляцоўках адначасова ажыццяўляецца і гандаль таварамі лёгкай прамысловасці.

Пакупкі оптам і ў розніцу можна зрабіць у любы кастрычніцкі ці ліставадаўскі ўік-энд: кірмашы будуць праходзіць у розных раёнах Гомеля. Кожныя выхадныя пляцоўкі разгортваюцца ў раёне зоны адпачынку «Сажалкі», корпуса № 4 медуніверсітэта, Палаца водных відаў спорту, Палаца культуры «Касцюкоўка», каля крамы «Март Інн», што па вуліцы Барыкіна. Традыцыйна агародніну і садавіну можна набыць і ў самым цэнтры горада над Сожам — на плошчы Паўстання. Менавіта там і быў зроблены манітарынг цэн на асеннюю агародніну.

## Віцебск

### Па жывую рыбу, як заўсёды, былі чэргі

**У Віцебску восеньскія кірмашы вельмі папулярныя і, безумоўна, будуць праходзіць далей. І, нават, калі цэны на агародніну ды іншае, нярэдка бывае, аналагічныя, як на рынках, усё роўна народ імкнецца зрабіць восеньскія нарыхтоўкі менавіта на кірмашы.**

Традыцыйна галоўным месцам правядзення чарговага кірмашу стала вуліца Леніна — адна з цэнтральных у Віцебску. Гандлявалі праз дарогу ад сімвала старажытнага горада — будынка ратушы. Гандлёвая часовая «зона» была даўжынёй каля дзвюх сотняў метраў. Людзей было шмат, і дождж, які перыядычна церусіў, не сапсаваў асаблівы кірмашовы настрой.

Наконт цэннікаў. Бульбу можна было купіць за 32—35 капеек за кіло. І толькі ў адным гандлёвым «пункце» за 28 капеек. За моркву прасілі 50—55 капеек, кошт кілаграма буракоў — 40, 43, 45 капеек, цыбуля каштавала 45, 53, 60 капеек, а вось кошт на капусту ва ўсіх гандляроў быў аднолькавы — 44 капейкі.

Памідоры ў адным месцы прадавалі за 1 рубель 8 капеек за кіло, а недалёка — па 1,3 рубля... Салодкі перац можна было назапасіць таксама за 1,3 рубля.

Мёд куплялі ахвотна. У залежнасці ад гатунку літр каштаваў 13 і 15 рублёў, а палова літра адпаведна 7 і 8.

Па рыбу, як заўсёды, былі чэргі. І, па-ранейшаму, — да аўтамабіля з жывой рыбай рыбгаса «Навінкі» з Пастаўскага раёна. Дарэчы, і ў рабочыя дні прадстаўнікі гаспадаркі гандлююць на розных вуліцах абласнога цэнтра. У дзень кірмашу карпа элітнага прадавалі па 4 рублі 37 капеек за кілаграм, карпа буйнога — па 3,61 рубля, таўсталобіка адборнага — па 3 рублі.

## Магілёў

### Каб дзеці ведалі, дзе расце бульба

**Дзе шукаць восеньскі кірмаш у Магілёве, распісана аж да канца лістапада. Расклад можна знайсці на сайтах аблвыканкама, мясцовых СМІ, а таксама ў выглядзе запрашэнняў на канкрэтныя пляцоўкі — на пунктах прыпынку грамадскага транспарту і ў іншых шматлюдных месцах.**

У апошнія вераснёўскія дні кірмашы ў Магілёве працавалі на тэрыторыі дзвюх школ — 13-й у Кастрычніцкім раёне і 45-й — у Ленінскім. Арганізатары паклапаціліся па максімуме наблізіць гандлёвыя пляцоўкі да спальных раёнаў. Не апошнюю ролю мае і выхаваўчы працэс, каб дзеці ведалі, што бульба не ў краме расце.

А ўраджай, мяркуючы па прылаўках, атрымаўся неблагі. І цэны прывабныя. Бульба была нават па 20 капеек за кілаграм, памідоры ад рубля да трох, кіло цыбулі можна было набыць за 60 капеек, морква каштавала ў межах ад 70 капеек да 1,1 рубля, капуста — ад 40 капеек і вышэй. Самыя танныя агуркі прапанавалі па 2 рублі за кілаграм. За грушы прасілі 2,5 рубля, журавіны аддавалі за 3 рублі слоік або за 6 рублёў — кілаграм. Народ не разменьваўся на дробязі, купляў адразу мяхамі.

— У нас сёлета ад дажджу прапала ўся бульба, таму купілі шмат, — прызналася адна з пакупніц. — Да майго дома адсюль рукой падаць. Вельмі добра, што кірмаш да нас на раён завітаў. І выбар вельмі добры. За мех бульбы аддала ўсяго 10 рублёў. А яшчэ купіла два качаны капусты па 50 капеек за кілаграм.

Было з чаго выбраць і аматарам-садаводам. Знаўцы кажуць, што найлепшая пара для пасадкі садовых дрэў і кустоў — да сярэдзіны кастрычніка. Прапаноўвалі ўсё — ад беларускай ігрушы да замежнага персіка. Саджанцы яблыні каштавалі, напрыклад, 10 рублёў, ігрушы — 15.

Гаспадар вялікай калекцыі саджанцаў і ягадных кустоў Міхаіл Уладзіміравіч па адукацыі эканаміст, але вырошчваннем саджанцаў займаецца з 1996 года. Калі жадаеце атрымаць ад пакупкі найбольшую карысць, раіць ён, трэба звяртацца да праверaных гандляроў і крыху самому разбірацца ў гэтай справе. Напрыклад, дрэўцы з-пад Брэста або Гродна не заўсёды змогуць парадаваць жыхароў нашых больш паўночных раёнаў.

Восень — гэта і час каштаваць мясцовую рыбу. Летам яна яшчэ расце ў саджалках, а з верасня паступае ў шырокі продаж. І, мяркуючы па чэргах, прадукт запатрабаваны. Лінёў у Магілёве куплялі па 5 рублёў за кіло, карпа — па 4,5 рубля, белага амура — па 6 рублёў. Бралі не па адным кілаграме. Вельмі ж апетытна рыбка выглядала.

# па танную бульбу — у Магілёў, у Гродна

## Брэст

### Да такога багацця агародніны яшчэ і кавалак сала

**Людзі найбольш цікавіліся агароднінай, выбіралі таго прадаўца, які прапанаваў танней, да яго нават выстройвалася чарга.**

Напрыклад, Целяханскі філіял Івацэвіцкага спажыўтаварыства прывёз шмат разнастайнай прадукцыі. У іх былі адны з самых танных памідораў, прычым, прывабнага выгляду. Аддавалі па рублі за кіло. Таму прадавец працавала даволі напружана, увесь час падыходзілі людзі. Целяханцы таксама прывезлі на кірмаш насенне кропу ў фасоўцы па сто грамаў, і гэты тавар карыстаўся попытам. Яшчэ людзі назапашвалі журавіны, часнок, сухафрукты.

Грушы на кірмашы можна было набыць у межах ад 80 капеек да 1,8 рубля. Часнок прапаноўвалі па 3,5 рубля за кілаграм. Гэтым разам многія прадавалі фасолю, крыху больш за тры рублі каштаваў кілаграм, а яшчэ баклажаны, гарбузы, кавуны. «Да такога багацця асенняй агародніны яшчэ б кавалак сала», — пажартаваў адзін з наведвальнікаў кірмашу, які старанна выбіраў памідоры. І яму некалькі чалавек паказалі на першы рад ад уваходу. Там сапраўды размясціўся павільён Драгічынскага райспажыўсаюза, кааператары прапанавалі свініну, ялавічыну, а таксама дамашнюю бараніну ды апетытных гусей. Маладыя пакупнікі паглядзелі на жоўтую тлустую гусь і сказалі, што перад новым годам яны абавязкова купілі б гэтую птушку, а цяпер ўсё-такі па 9 рублёў кілаграм... Галоўнае, што выбар быў. Побач Аранчыцкая птушкафабрыка прадавала з машыны яйкі, а рыбгас прывёз карпаў. Так што на кірмашы можна было купіць самыя розныя прадукты харчавання ад вытворцаў і па нізкіх цэнах.

## Міншчына

### Назапасіць «вітаміны» на зіму

**Восеньскія кірмашы стартавалі на Міншчыне 16 верасня і прадоўжацца да 4 лістапада. Ветэранам вайны, як заўсёды, набытыя дары восені дапамогуць даставіць на дом бясплатна райвыканкамы і Жодзінскі гарвыканкам спецыяльна выдзеленым для гэтага транспартам.**

29 і 30 верасня чарговы рэгіянальны кірмаш прайшоў у Барысаве на пляцоўцы на вуліцы Стаханаўскай, што прылягае да гарадскога Палаца культуры. Цэны на прадукцыю былі даволі прымальныя, але некаторыя пакупнікі ўсё ж такі імкнуліся іх збіць. Кірмаш — гэта своеасаблівы дыялог, дзе можна дамовіцца аб цане. Дзесьці прадаўцы былі згаворлівыя. І пры пакупцы чалавекам некалькіх мяхоў бульбы, напрыклад, крыху саступалі ў цане. Некаторыя прадпрыемствы сапраўды знізілі цэны і надбаўкі на свой тавар. Гэта і зразумела — большы аб'ём пакупак, большы — тавараабарот.

— Я жыву ў шматкватэрным доме, сваю дачу прадала, бо не хапае сіл апрацоўваць зямлю, — кажа пенсіянерка з Барысаўскага раёна Ганна Мікалаеўна. — Таму вось з сынам прыехалі на кірмаш запасціся самым неабходным. Пару мяхоў бульбы не пашкодзіць, нялішнімі будуць капуста, буракі, морква. Тым больш што цэны цалкам задавальняюць, на рынку і ў крамах усё даражэйшае.

— На восеньскіх кірмашах купляю агародніну не першы год, — уступае ў размову маладая жанчына. — Мы прыехалі з мужам з суседняга Смалявіцкага раёна. — Свайго зямельнага ўчастка не маем, няма і сваякоў у вёсцы, бацькі жывуць у Брэсцкай вобласці. Купім бульбы, морквы, буракоў і яблыкаў для дзяцей.

Кірмаш — гэта не толькі нагода назапасіць на зіму «вітамінаў», але і магчымасць выбрацца ў людзі ўсёй сям'ёй, паласавацца кандытарскімі вырабамі, марожаным, шашлыкамі, павесяліцца, паслухаць песні ў выкананні самадзейных выканаўцаў. І, вядома, набыць сувеніры, вырабы рамеснікаў.

## Мінск

### Колькі каштуе «другі хлеб» у сталіцы

**Пара сельскагаспадарчых кірмашоў у Мінску пачалася 22 верасня, а завершыцца сезон восеньскіх нарыхтовак 4 лістапада. Усяго ў горадзе плануецца правесці 150 такіх буйных мерапрыемстваў. А ў самым буйным раёне сталіцы — Фрунзенскім — кожную суботу арганізуецца выязны гандаль агароднінай і садавіной перад Лядовым палацам, што каля метро «Пушкінская». Туды накіраваўся па пакупкі і рэпарцёр «Звязды».**

Першае, што бачыш каля Лядовага, гэта велізарную чаргу (чалавек 30—40) па жывую рыбу. Традыцыйна, як гарачыя піражкі, разбіралі карпа. Вялікія, элітныя прадаваліся за 4 рублі 30 капеек за кілаграм, а сярэднія наогул — за 3 рублі 69 капеек. Былі ў продажы і шчупак (4 рублі 39 капеек), і карась (2 рублі 66 капеек). Праўда, павышаны попыт да рыбы стваraўся не толькі дзякуючы нізкім цэнам. Рыбгас з Ганцавіч не меў канкурэнтаў. Прычым гандлявала адна машына.

А па бульбу і яблыкі чэргаў не было. Можа таму, што выбар і цэны — на любы густ і кашалёк. Напрыклад, бульба каштавала 30—40 капеек за кіло, а трошкі драбнейшая — за 20 капеек. Яблыкі прадаваліся ад 70 капеек да рубля, але былі варыянты. Напрыклад, вялікія зялёныя яблыкі, якія яшчэ паляжаць, прапаноўвалі за 30 капеек. Шмат на кірмашы было і груш, якія ў залежнасці ад сорту і выгляду каштавалі ад 50 капеек да 2 рублёў.

Адразу выстраіліся чэргі па тое, на што ўжо не сезон, але прапаноўвалася па прывабных цэнах. Напрыклад, па свежыя памідоры і агуркі. Фермерскія памідоры нават на смак «ашаламляльна» адрозніваюцца ад цяплічных. Таму і бяруць іх лепш. Сярэднія цэны на іх — ад 1,5 рубля да 3 рублёў. У каго ўраджай большы, той прадаваў памідоры па рублі. Агуркі былі не ва ўсіх, таму цэны на іх былі рынкавыя — 2—2,5 рубля за кілаграм.

Цыбулю можна было набыць коштам ад 70 капеек да 1 рубля за кілаграм, капусту — за 35—60 капеек, буракі — за 50—70 капеек, моркву — за 40—80 капеек.

Пачаўся ўжо сезон журавін. Ягад хапае па 5—5,5 рубля за кілаграм. Таксама шмат на кірмашы грэцкіх арэхаў. Да нас яны «прыехалі» ад фермераў, якія жывуць на паўднёвым захадзе краіны.

У «меню» кірмашу былі і мясныя паўфабрыкаты, каўбасныя вырабы з мінімальнай гандлёвай нацэнкай. Мабыць, другая па велічыні чарга была па яйкі. Дзясятак яек д-0 прадаваўся ўсяго за 1 рубель 60 капеек. У гэты дзень, мабыць, ніхто не пайшоў без пакупак.

**Матэрыялы падрыхтавалі:**
**Вольга АНУФРЫЕВА.**
**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Сяргей КУРКАЧ.**

## Што пачым

### Самыя прывабныя цэны на сезонных кірмашах

Фота БелТА.

| Што купляем? (цэны ў рублях) | Дзе купляем? | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Брэст | Віцебск | Гомель | Гродна | Магілёў | Мінск | Мінская вобласць (Барысаў) |
| Бульба | 0,30-0,35 | 0,28-0,35 | 0,30-0,44 | 0,25-0,30 | 0,20-0,52 | 0,20-0,35 | 0,40-0,60 |
| Морква | 0,50-0,60 | 0,50-0,55 | 0,60-0,75 | 0,50-0,60 | 0,70-1,1 | 0,50-0,80 | 0,45-0,80 |
| Буракі | 0,50-0,55 | 0,40-0,45 | 0,50-0,70 | 0,60 | 0,45 | 0,50-0,70 | 0,40-0,80 |
| Цыбуля | 0,40-0,60 | 0,45-0,60 | 0,45-0,62 | 0,55-0,80 | 0,60-1,0 | 0,70-1,0 | 0,5-1,0 |
| Капуста | 0,45-0,50 | 0,44 | 0,45-0,59 | 0,25-0,45 | 0,40-0,50 | 0,40-0,60 | 0,40-1,50 |
| Памідоры | 1,0-2,9 | 1,3-1,8 | 0,90-2,00 | 1,30 | 1,0-3,0 | 1,50-3,0 | 1,3-3,0 |
| Салодкі перац | 1,2-1,8 Сеткай - 0,60 | 1,3 | 1,60-2,65 | 1,50-2,0 | 3,5 | 1,4-1,6 | 1,2-2,5 |
| Мёд (сапраўдны) | 8,0-8,5 | 13,0-15,0 | 10-10,6 | 8,0-11,0 | 11,0-13,0 | 10,0-14,0 | 8,0-14,0 |
| Рыба (карп) | 4,16 | 4,37 | 4,90-5,00 | 4,50 | 4,5 | 3,69-4,3 | 3,5-4,5 |

Інфаграфіка Аляксандра АСІПЕНКІ.

Приорбанк RBI Group

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!
## «ПРИОРБАНК» ОАО
## ДОВОДИТ ДО ВАШЕГО СВЕДЕНИЯ ИНФОРМАЦИЮ О РАЗМЕРЕ И ПОРЯДКЕ ВЫПЛАТЫ ДИВИДЕНДОВ

Размер дивидендов по простым акциям на основании данных промежуточной бухгалтерской (финансовой) отчетности «Приорбанк» ОАО за I полугодие 2018 года – 41 копейка на одну простую (обыкновенную) акцию.

Размер дивидендов по привилегированным акциям за 2017 год – 35 копеек на одну привилегированную акцию.

Размер дивидендов по привилегированным акциям за 2018 год – 35 копеек на одну привилегированную акцию.

Выплата дивидендов будет начата не позднее 3 октября 2018 года. Срок выплаты – в течение 60 дней.

Выплата осуществляется на счета акционеров в соответствии с законодательством. Дивиденды могут быть выплачены без открытия счета в течение трех банковских дней после поступления в депозитарий банка соответствующего заявления физического лица.

Телефон для справок **8 (017) 289 90 90.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ
№ 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190

**Дополнения и изменения к проектной декларации по объекту: «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами торгово-общественного назначения по ул. Купревича», опубликованной в газете «Звязда»14.07.2018 г. № 133**

Застройщик: ОАО «Минский домостроительный комбинат» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей решением Мингорисполкома 14 февраля 2001 г. за № 100258980.

Гражданам для заключения договоров предлагается 40 квартир (с включенным в стоимость строительства квартиры машино-местом), из них:

4 однокомнатные квартиры, общей площадью 43,72 – 44,25 кв. м;

3 однокомнатные квартиры, общей площадью 48,24 – 48,43 кв. м;

3 однокомнатные квартиры, общей площадью 50,53 – 50,62 кв. м;

5 двухкомнатных квартир, общей площадью 57,16 – 57,49 кв. м;

10 двухкомнатных квартир, общей площадью 63,32 – 63,94 кв. м;

10 трехкомнатных квартир, общей площадью 80,43 – 82,87 кв. м;

5 трехкомнатных квартир, общей площадью 92,72 – 93,89 кв. м.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения и машино-места в гараже-стоянке открытого типа.

Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры с включенным в стоимость м/местом в двухэтажной гараж-стоянке на 191 м/место.

1-комнатной квартиры, общей площадью 43,72 – 44,25 кв. м с открытым м/местом – 1185 долларов США, с крытым м/местом – 1212 долларов США;

1-комнатной квартиры, общей площадью 48,24 – 50,62 кв. м с открытым м/местом – 1173 доллара США, с крытым м/местом – 1200 долларов США;

2-комнатной квартиры, общей площадью 57,16 – 57,49 кв. м с открытым м/местом– 1140 долларов США, с крытым м/местом – 1161 доллар США;

2-комнатной квартиры, общей площадью 63,32 – 63,94 кв. м с открытым м/местом– 1118 долларов США, с крытым м/местом – 1137 долларов США;

3-комнатной квартиры, общей площадью 82,13 – 93,18 кв. м с открытым м/местом – 1068 долларов США, с крытым м/местом – 1082 доллара США».

Окончательная цена объекта долевого строительства определяется в договоре с учетом поэтажного расположения квартир, а также включенного в стоимость крытого либо открытого м/местом.

Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к соответствующей иностранной валюте, установленному Национальным банком на день платежа.

Условия оплаты: первоначальный взнос в размере 50 % вносится в следующем порядке: в течение 5 календарных дней с даты регистрации договора в Мингорисполкоме – 20 % от стоимости договора, в течение последующих 25 календарных дней – в размере 30 % от стоимости договора. Оставшаяся сумма выплачивается поэтапно, в соответствии с графиком платежей, до декабря 2019 года.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве**

Прием заявлений от граждан осуществляется отделом собственного строительства ОАО «Минский домостроительный комбинат» с 8 октября 2018 года по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (отдел собственного строительства) понедельник – четверг с 8.15 до 16.50, обед с 12.00 до 12.45, пятница с 8.15 до 15.30, обед с 12.00 до 12.45.

Телефоны для справки: +375 (44) 7771158, 017 2072060.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

УНП 100251980

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению торгово-производственного унитарного предприятия «Слуцкий агросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1: здание специализированное для общественного питания (ресторан «Вежа Града»),** общей площадью **1744,9 кв. м,** инв. № **640/С-1682**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером **624650100001001020** (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью **0,3615 га**, по адресу: **Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. Ленина, 146.**

Часть объекта (136,6 кв. м) сдается в аренду *(сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона или продавца*).

Начальная цена с НДС (20 %) – **600 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **60 000,00** бел. руб.).

**Лот № 2: здание автотранспортного цеха,** общей площадью **891,7 кв. м,** инв. № **640/С-26793**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером **624681302601000653** (предоставлен на праве аренды) площадью **0,4496 га**, по адресу: **Минская область, Слуцкий район, Весейский с/с, аг. Весея, ул. Шоссейная, 11.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **81 120,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **8 112,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в следующем размере: по лоту № 1 – 1 (одного) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **05.11.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.11.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельское пчеловодство» (продавец) извещает о проведении 2 ноября 2018 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-76858**, площадью **834,0 кв. м**, назначение – здание многофункциональное, наименование – **здание многофункциональное.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **340100000003001814** общей площадью **0,1140 га** – для эксплуатации и обслуживания здания склада **(право постоянного пользования).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Полукруглая, 14Б** | **7 764,00** | 776,40 |

**Продавец:** ОАО «Гомельское пчеловодство», г. Гомель, ул. Крестьянская, 45. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 606-50-66 – Ларионов Дмитрий Сергеевич – директор ОАО «Гомельское пчеловодство». **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельское пчеловодство»):** р/с BY30 BAPB 3012 2005 9001 3000 0000 г. Минск ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X, УНП 400062569, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 2 октября 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 31 октября 2018 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8(029)126-66-62.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Минский мясокомбинат» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **торгового помещения с инвентарным номером 500/D-70782710, общей площадью 698,2 кв. м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 15-3Н и оборудование *(29 ед.)*.** Объект сдается в аренду *(сведения об арендаторе можно получить у организатора аукциона или продавца)*.

Начальная цена с НДС (20 %) – **2 500 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **250 000,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.09.2018. Аукцион состоится **23.10.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.10.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## Уважаемые акционеры ОАО «Минский домостроительный комбинат»

**15 октября 2018 года состоится внеочередное собрание акционеров ОАО «Минский домостроительный комбинат», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43. Место проведения: г. Минск, ул. Пономаренко, 43, второй этаж, актовый зал предприятия**

**Повестка дня собрания:**

1. О досрочном прекращении полномочий членов Ревизионной комиссии Общества.

2. Избрание членов Ревизионной комиссии Общества.

3.О внесении изменений и дополнений в Положение о ревизионной комиссии Общества.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (отдел собственного строительства) с 8 октября 2018 г. по 15 октября 2018 г. в рабочие дни с 9.00 до 16.00, в день проведения собрания с 9.00 до 15.00.

Регистрация участников собрания с 15.15 до 15.45 по месту проведения собрания. Начало работы собрания – 15 октября 2018 г. в 16.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 5 октября 2018 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера Общества – паспорт и нотариально удостоверенную доверенность.

УНП 100251980

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Минский комбинат хлебопродуктов», г. Минск, ул. Слесарная, 48 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Жилой дом** | Здание одноквартирного жилого дома | 99,1 кв. м | 601/С-13258 |
| **Адрес** | Минская обл., Логойский р-н, Острошицкий с/с, д. Бояры, ул. Центральная, д. 12 | | |

Составные части и принадлежности: одноэтажный кирпичный жилой дом с сараем пристройкой 1

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | пл. 0,0851 (га), предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт, пл. 0,005 га |

**Начальная цена без учета НДС – 13 489,85 бел. руб. (снижена на 10 %)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» 17.08.2018 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **23.10.2018 г.** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **19.10.2018 г.** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Узденского райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества:

**Лот 1: здание магазина, общей площадью 112,0 кв. м**, **регистрационное удостоверение от 04.05.1999 № 5649, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683208201000070, площадью 0,0783 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Старые Морги**.

Начальная цена с НДС – **1 840,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **184,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 91 %.**

**Лот 2: здание магазина «Продукты № 2» (с пристройкой, теневым навесом, сараем и гаражом) общей площадью 122,3 кв. м, инв. № 623/С-58206, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625650100001000601 площадью 0,0831 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. Полесская, 31.** *На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона электрических сетей, площадью 0,0014 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **30 300,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **3 030,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 50 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере: по лоту № 1 – 10 (десять) процентов, по лоту № 2 – 5 (пять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 07.08.2018. Аукцион состоится **15.10.2018** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.10.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Торговое унитарное предприятие «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза», г. Минск, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 62, каб. 215 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Здание торгового центра «Радуга»** | Здание многофункциональное | 832,3 кв. м | 240/С-44954 | Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Строителей, 1А |

Составные части и принадлежности: крыльца.

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1574** га, предоставлен на праве постоянного пользования для использования под торговый центр «Радуга»

**Начальная цена с НДС 20 % – 474 276,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 08.11.2018 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 06.11.2018 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Чужыя...

# НЯБАЧНАЯ ПАГРОЗА

## Якія насякомыя-шкоднікі «ідуць у атаку» на беларускія расліны?

**Калі спытаць у беларусаў пра самае шкоднае насякомае, многія напэўна назавуць каларадскага жука. Але спецыялісты запэўніваюць: ёсць яшчэ шмат інвазійных (нежаданых) відаў, здольных выклікаць сур'ёзныя праблемы як для беларускай прыроды, так і лясной, сельскай гаспадаркі. Пра іх і расказваюць у сваёй публікацыі Алег СІНЧУК, супрацоўнік біялагічнага факультэта БДУ, і Кацярына ГРЫШЧУК і Дар'я ЛАЎРЫЕНЯ, студэнткі гэтага факультэта.**

### Чужыя, але не шкодныя

Пранікненне некантралюемых біялагічных інвазій — адна з галоўных экалагічных праблем сучаснасці. У апошнія дзесяцігоддзі назіраецца інтэнсіфікацыя транспартных патокаў, а таксама змяненне рэгіянальнага клімату, што і з'яўляецца перадумовай пранікнення «чужых» відаў на тэрыторыю нашай краіны.

Самы вядомы прыклад такой экспансіі — каларадскі бульбяны жук (паходзіць з Паўночнай Амерыкі), вядомы кожнаму агародніку як сур'ёзны шкоднік бульбы. Бо, калі не праводзіць ніякіх ахоўных мерапрыемстваў, можна застацца зусім без ураджаю! Гэты від трапіў на тэрыторыю Беларусі яшчэ ў 1956 годзе, і да сёння наступствы яго ўсялення прыводзяць да сур'ёзных фінансавых трат.

Пранікненне «чужых» відаў адбывалася і раней. Так, у перыяд XVIII — пачатку XX стагоддзя ў нашу краіну былі выпадкова завезены рыжы таракан (Паўднёвая Азія) і фараонавая мурашка (Усходняя Афрыка), якія не змаглі прыстасавацца да натуральных умоў і жывуць толькі побач з чалавекам (сінантропныя віды). Пры іх з'яўленні ў нашых кватэрах і дамах можна нажыць нямала клопату. Такія віды з'яўляюцца чужароднымі, але не інвазійнымі. Каб прылічыць від да інвазійных, неабходна, каб ён засяліўся ў натуральных умовах, заснаваў устойлівую групу, якая здольная да ўзнаўлення і прыводзіць да сур'ёзных эканамічных, экалагічных і сацыяльных праблем.

### Маленькія агрэсары

Сітуацыя змянілася з пранікненнем люцэрнавай тлі (Паўночная Амерыка), лістоўнічнага хермеса (горна-таежны пояс Еўразіі), букавай тлі (Заходняя, Паўднёвая і Цэнтральная Еўропа), ілжэшчытоўкі туевай (Паўночная Амерыка) і каларадскага бульбянога жука, якія пачалі аказваць сур'ёзны ўплыў на зялёныя насаджэнні і сельскагаспадарчыя пасевы.

З канца XX — пачатку XXI стагоддзя працэсы пранікнення «чужых» відаў паскорыліся, што абумоўлена, у першую чаргу, глабалізацыяй эканомікі. На тэрыторыю Беларусі праніклі такія інвазійныя віды, як лістаблошка самшытавая і тля арэхавая вялікая (Міжземнамор'е), тля зялёная цытрусавая і ліпавая моль-стракатка (Усходняя Азія), тля алычовая (Закаўказзе і прылеглыя тэрыторыі Малой, Пярэдняй і Сярэдняй Азіі), каштанавая мініруючая моль (захад Балкан), белаакацыевыя молі-стракаткі (Паўночная Амерыка), божая кароўка-арлекін (Азія) і іншыя.

Каштанавая мініруючая моль прывяла да катастрафічных наступстваў для насаджэнняў каштана конскага звычайнага. З-за яе актыўнасці дрэвы рана страчваюць лісце, змяншаецца выхад насення і нават адбываецца паўторнае цвіценне каштанаў. Ліпавая моль-стракатка прыводзіць да раняй страты лісця і зніжэння выхаду пчолапрадуктаў у розных відаў ліп. Божая кароўка-арлекін выцясняе мясцовыя віды божых каровак, выкарыстоўваючы іх кармавыя рэсурсы і нават з'ядаючы іх лічынак!

### Хто пад каранцінам?

Ліпавая моль-стракатка.

Міны ліпавай молі-стракаткі.

Безумоўна, працэсы пранікнення новых відаў на тэрыторыю Беларусі не спыняюцца. Каранцінныя службы сочаць за пранікненнем найбольш небяспечных з іх. Так, пакуль атрымліваецца стрымліваць папуляцыю заходняга кукурузнага жука (гэты від ужо ахрысцілі каларадскім кукурузным жуком з-за яго паходжання), які асталяваўся ў Брэсцкай вобласці. Сярод такіх відаў можна назваць таксама і паўднёваамерыканскую таматную моль. У нашай краіне яна была ўпершыню выяўлена ў 2011 годзе ў цяпліцах з памідорамі. На гэтыя цяпліцы налажылі каранцін і распрацавалі мерапрыемствы па лакалізацыі і ліквідацыі ачага шкодніка, што паспяхова ўдалося зрабіць.

Акрамя таго, з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі сёлета магчыма пранікненне ясеневай ізумруднай вузкацелай златкі — шкодніка з лясоў Усходняй Азіі і Далёкага Усходу Расіі. Гэты від сур'ёзна пашкоджвае розныя віды ясеняў. Жыццядзейнасць насякомага прыводзіць да катастрафічнага ўсыхання ясеневых насаджэнняў у ЗША і Еўрапейскай частцы Расіі. Па выніках нашых абследаванняў, у 2018 годзе ясеневая златка не выяўлена ў прыгранічных да Беларусі гарадах Рослаўль (Смаленская вобласць) і Сураж (Бранская вобласць).

* * *

Пранікненне «чужых» відаў насякомых можа прыводзіць да сур'ёзных экалагічных, сацыяльных і эканамічных наступстваў. Наша задача — быць уважлівымі пры куплі раслін, развядзенні хатніх шасці- і васьміногіх гадаванцаў (не трэба выпускаць іх у дзікую прыроду!). Пры выяўленні незразумелых відаў жывёл, паважаныя чытачы, дасылайце іх фотаздымкі на электронную пошту студэнцкай навуковай лабараторыі «Структура і дынаміка біяразнастайнасці» кафедры заалогіі біялагічнага факультэта БДУ: biodiversity.lab.bsu@mail.ru, ці на адрас: г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 4, біялагічны факультэт, кафедра заалогіі, Сінчуку Алегу Віктаравічу.

...і свае

# ЧАМУ КАЖАНЫ ПЕРАСТАЛІ АДЛЯТАЦЬ НА ПОЎДЗЕНЬ?

**Яны жывуць побач з намі. Любяць сяліцца ў шчылінах шматпавярховікаў, бо сучасныя дамы кажанам замяняюць горы. Асаблівай нязручнасці нябачныя сусядзі людзям не нясуць, затое карысць ад іх відавочная: яны знішчаюць вялікую колькасць насякомых (за ноч кожная асобіна здольная праглынуць іх на палову сваёй вагі). Калі б не кажаны, то размножаныя шкоднікі з'елі б нашы лясы, паркі і агароды. Амерыканцы нават спрабавалі вылічыць апасродкаваны прыбытак ад кажаноў. Скажам, для аднаго толькі штата Тэхас пражэрлівыя лятучыя мышкі эканомяць мільёны долараў, бо гэта яшчэ і выдатная эканомія на пестыцыдах. У рукакрылых няма канкурэнтаў у барацьбе за «харчовыя рэсурсы», бо палююць яны ўначы, а птушкі ловяць насякомых хіба што вячэрнім прыцемкам ды зрання.**

### МЫШЫ ПАДКАЖУЦЬ...

Кажаны — адны з самых старажытных млекакормячых жывёл, да таго ж адзіныя здольныя для актыўнага палёту. А калі яны ўзняліся ў неба, то зразумелі, што там ім нічога не пагражае. Нават няма драпежнікаў, якія б мэтанакіравана палявалі на мышак з крыламі, хіба што выпадкова кажаны могуць патрапіць пад кіпці савы, альбо рэдкім разам у дупло да іх залезе куніца. І сёння ў свеце налічваецца каля паўтары тысячы відаў кажаноў. У Беларусі сустракаецца 19, у Мінску — каля 12.

Сёння цэлыя калектывы вучоных у свеце займаюцца генетыкай кажанаў для таго, каб даведацца пра іх механізмы ўстойлівасці да захворванняў, у тым ліку ракавых, а таксама высветліць, што дазваляе звярку жыць даволі доўга. Існуе экалагічнае правіла: чым меншыя лінейныя памеры, тым большы ўзровень метабалізму ў млекакормячых, цеплакроўных жывёл і, адпаведна, тым меншая працягласць жыцця. Кажаны — выключэнне з гэтых правілаў. У маленькіх летуноў максімальны тэрмін жыцця — 43 гады (у пячоры знайшлі акальцаваную мышку і менавіта па пакінутай людзьмі метцы вылічылі яе ўзрост). І нават 15 гадоў (на столькі ў сярэднім «разлічаны» летуны) — тэрмін даволі вялікі. (Напрыклад, звычайныя мышы, як правіла, жывуць каля двух гадоў.)

### ПАЛЯВАННЕ НА НЕВІДЗІМАК

І тым не менш колькасць рукакрылых скарачаецца, у звяркоў нізкі рэпрадуктыўны патэнцыял: самка кажана нараджае толькі адну-дзве асобіны ў год. Да таго ж і змены клімату і прыродных арыялаў могуць уплываць на жыццё звяркоў...

Каб звярнуць увагу грамадскасці на гэтую праблему, ва ўсім свеце праводзяцца мерапрыемствы, прысвечаныя рукакрылым. Ладзілася такое і ў Мінску — ноч кажаноў. Разам з **навуковым супрацоўнікам лабараторыі малекулярнай заалогіі НПЦ па біярэсурсах НАН Беларусі Алексеям ШПАКАМ** мы выправіліся ў «паляванне» на мышэй у Лошыцкім парку. Праўда, пабачыць кажаноў на той экскурсіі (а праводзілася яна ўначы) так і не давялося. Затое мы пачулі, якімі гукамі напоўнена начная мінская прастора, і нават высветлілі, што за невідзімкі ў гэты час над намі лёталі. Вылічыць, дзе хаваюцца кажаны, дапамагаў спецыяльны прыбор — бат-дэтэктар. Ён «перакладае» ўльтрагук і дазваляе ўстанавіць хвалю, на якой крычаць рукакрылыя. Па характары гуку і частаце можна даведацца, які від кажаноў схаваўся ў цемры.

У Лошыцкім парку найперш мы шукаем звяркоў каля вады. Для іх гэта любімае месца палявання, да таго ж яны на ляту пьюць ваду. У дэтэктары чуецца трэск. Такі сухі, дробны гук падказвае, што тут палюе лясны нетапыр.

— Калі інтэрвалы паміж гукамі скарачаюцца, значыць, кажан да некага набліжаецца, і можна нават пачуць, як штосьці з'елі на ляту, — тлумачыць Алексей Шпак. — Многія віды збіраюць насякомых з воднай гладзі, з лістоў дрэў. Ёсць і такія, хто здольны збіваць ахвяру ў палёце, — яна трапляе ў растапыраныя заднія лапы (паміж пальцамі там таксама скурная перапонка, і ў выніку атрымліваецца добры «кошык» для лоўлі). Крыкі кажаноў для іх саміх вельмі моцныя — усё роўна як для чалавека гук турбін самалёта, які ўзлятае. Таму на той час, як яны крычаць, у іх блакіруюцца вушы...

Наступны лятун, якога давялося пачуць у Лошыцкім парку, гучаў ужо па-іншаму. Па словах даследчыка, калі дэтэктар выдае гук, падобны да таго, што нехта пальцам правёў па грэбені, вы маеце справу з начніцамі, а калі з прыборчыка чуецца, быццам падаюць кроплі вады, — з вячэрніцамі. Трэба сказаць, што эхалакацыяй кажаны карыстаюцца толькі падчас начных паляванняў — усё ж яна даволі энергазатратная.

### ХТО Ў ДАМКУ ЖЫВЕ?

Без спецыяльнага прыбора гукі, якія выдаюць начныя паляўнічыя, для чалавечага вуха недаступныя. Але ўсё ж пачуць кажаноў мы можам. Напрыклад, калі натрапім на старыя дуплістыя дрэвы, якія ператварыліся ў радзільны дом для мышэй. Самкі жывуць асобна. Самцы не дапускаюцца ў мацярынскія радзільныя калоніі. Мы падыходзім да аднаго з такіх дрэў, якое і раней з-за вялікай мышынай валтузні «звінела», але ў гэты час сховішча кажаноў пустуе.

Таксама мы праверылі і домікі, змайстраваныя актывістамі арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» спецыяльна для кажаноў. Мышыныя «шпакоўні» больш плоскія, з вузкімі адтулінамі знізу. Дзіва, што ў кожнай такой скрыначцы можа знайсці прытулак некалькі дзясяткаў кажаноў — гэтыя жывёліны таўшчынёй з палец заўсёды гатовыя пацясніцца.

— Такія домікі могуць служыць добрым прытулкам для адзіночных самцоў ці невялікіх груп, проста для жывёл, якія пералятаюць на поўдзень і ім трэба недзе спыніцца, — расказвае хіраптаролаг.

Так, з даўніх часоў кажаны, як і птушкі, адлятаюць, каб у маразы не змерзнуць. Як правіла, беларускія рукакрылыя выбіраюць такія краіны, як Аўстрыя, Румынія, Балгарыя. Прычым ляцяць яны туды... спаць, бо ў зімовы час і ў гэтых краінах няма корму. Але цяпер у сувязі з пацяпленнем клімату некаторыя рукакрылыя, напрыклад двухколерны кажан, сталі заставацца ў нас і на зіму. Прасунутыя мышкі ўцямілі, што зусім неабавязкова некуды ляцець у пошуках пячор — людзі ж панабудавалі ўсяго і столькі, што знаходзіцца месца і для маленькіх нелегальных насельнікаў. На жаль, такія «навасёлы» часта падвяргаюць свае жыцці небяспецы. Зразумела, людзям не даспадобы такое суседства. Часам кажаноў у Мінску можна чуць аж да самага Новага года. Для звяркоў такая актыўнасць небяспечная, бо расходуецца шмат энергіі, назапашанай раней. І растрывожаная жывёлінка, якую, напрыклад, разбудзілі пасярод зімы, можа ў выніку нават загінуць. Калі кажан залятае ў ваша жытло ў цёплы час, дастаткова расчыніць акно альбо накрыць госця звычайнай скрынкай, вынесці на вуліцу і пасадзіць на дрэва. Калі ж звярок наведаў вас зімой, адпускаць маленькага летуна нельга. Тэлефануйце ў арганізацыю, якая дапамагае рукакрылым, — «Кажанаполіс». Актывісты ўладкуюць нязванага госця, узважаць, накормяць і пакладуць спаць да вясны... у спецыяльны халадзільнік.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Брэнд краіны

# ЧЫГУНАЧНЫЯ ГІСТОРЫІ

## Самыя цікавыя... вагоны Баранавіцкага аддзялення

**Музеі бываюць розныя. І некаторыя з іх — нават вельмі арыгінальныя. Так, у Баранавічах ёсць музей... чыгункі! І варта сказаць, што гэта адно з любімых месцаў жыхароў горада. Справа ў тым, што складаецца ён не толькі з традыцыйнага музейнага памяшкання. Найбольш цікавая частка экспазіцыі размешчана пад адкрытым небам. Там можна пабачыць самыя розныя ўзоры чыгуначнай тэхнікі. Прычым не толькі пастаяць побач, але дзесьці нават залезці на падножку вагона, зазірнуць унутр.**

Афіцыйна гэта месца называецца «Музей гісторыі Баранавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі». Тут размяшчаецца калекцыя паравозаў як айчыннай, так і замежнай вытворчасці. Ёсць цеплавозы, пасажырскія і грузавыя вагоны розных пакаленняў. Асабліва цікавым для многіх экскурсантаў з'яўляецца дзейны макет Баранавіцкага чыгуначнага вузла, усталяваны ў адным з пасажырскіх вагонаў (не зазірнуць проста немагчыма).

У іншых вагонах таксама ёсць экспазіцыйныя залы. Там прадстаўлены некаторыя інструменты, прыборы і механізмы (напрыклад, ручныя рэйкарэзныя і рэйкасвідравальныя станкі), якімі ў мінулым карысталіся чыгуначнікі. Можна пабачыць і грузавую дрызіну, якую многія ведаюць калі не з асабістага досведу, то па старых кінафільмах. Ёсць тут і дзейны семафор, і гідраўлічная калонка для запраўкі паравозаў вадой.

Гэтыя экспанаты, без сумнення, цікавыя як прафесіяналам (чыгуначнікам, гісторыкам), так і ўсім ахвотным. Дзе яшчэ атрымаецца трапіць у такі цэласны, напоўнены рознымі цікавінкамі тэхнічны свет? Дарэчы, у 2002 годзе ў музеі стварылі экспазіцыю тэхнікі чыгуначных войскаў. Гэта пуцеўкладчык, выправачна-падбівачная машына, машыны для будавання мастоў на палях, зенітна-кулямётныя ўстаноўкі, якія ставілі калісьці на спецыяльных чыгуначных платформах з браніраванымі адсекамі для размяшчэння кулямётных стужак.

Трапляючы ў гэты музей, усведамляеш прыгажосць і значнасць многіх ідэй, рэалізаваных пры стварэнні чыгунак. Тут можна дакрануцца да мінулага і ўбачыць гісторыю развіцця і ўдасканалення чыгуначнай тэхнікі ў розныя часы. Музей перыядычна папаўняецца новымі экспанатамі.

Непадалёк ад экспазіцыі пад адкрытым небам размяшчаецца і музейны будынак. Яго памяшканне даволі старадаўняе, датуецца пачаткам XX стагоддзя і з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. А сам музей быў створаны ў ім у 1984 годзе (аддзел тэхнікі быў уладкаваны ў 1999 годзе).

На цяперашні момант гэта самы вялікі чыгуначны музей у нашай краіне. Як адзначаюць яго куратары, тэхніку для экспазіцый збіралі з розных аддзяленняў. Штосьці прыносілі як чыгуначнікі, так і звычайныя жыхары горада.

У музейным дамку можна пабачыць шмат цікавых экспанатаў, звязаных з працай чыгуначнікаў. Напрыклад, старую таварную пломбу Палескай чыгункі станцыі Лахва (1899 год). Ёсць тут і жэтон работніка паравознага дэпо Аляксандраўскай чыгункі другой паловы XIX стагоддзя. Сярод цікавінак і паравозны ліхтар з газай другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя. Адметнай з'яўляецца і жалезная скрыначка машыністаў цягнікоў: у такой зазвычай вазілі ў ежу, асабістыя рэчы, дакументы. Тэлеграфны апарат Морзэ (яго таксама можна пабачыць) паступіў на чыгунку ў 1855—1856 гадах для сувязі паміж дзвюма суседнімі станцыямі, а тэлефон пачалі выкарыстоўваць у канцы XIX стагоддзя.

Важны рыштунак чыгунак яшчэ нядаўняга часу — станцыйны звон. Ударам у яго дзяжурны па станцыі падаваў сігнал-папярэджанне пасажырам пра час адпраўлення цягніка. Адзін удар звона — папярэджанне пра хуткае адпраўленне. Два ўдары — прапанова садзіцца ў цягнік. Тры ўдары — паведамленне аб адпраўленні. Першы ўдар рабіўся на пачатковых станцыях за 20 хвілін да адпраўлення, на прамежкавых станцыях, пры падыходзе цягніка да станцыі. Два ўдары звона рабіліся за дзве хвіліны да адпраўлення. Тры ўдары — на станцыях з прыпынкамі менш чым за дзве хвіліны пры спыненні цягніка.

Ёсць у музеі і шмат іншых невялікіх, але цікавых экспанатаў. Гэта скарасцямер кантролю за дзейнасцю машыніста на лініі, чарнільны прыбор з драўлянай ручкай і шклянымі пёрамі 1940-х гадоў (шкляныя пёры выкарыстоўваліся для запаўнення паравозачных дакументаў пад капірку).

Варта адзначыць, што Палескі вакзал, побач з якім размяшчаецца музей, быў разбураны падчас Другой сусветнай вайны. А ў сваім сучасным выглядзе быў пабудаваны ўжо пасля вызвалення горада.

Баранавічы — вядомы чыгуначны вузел, горад, які ўзнік на станцыі. Пэўна, завітаўшы сюды і маючы хаця б адну вольную гадзінку, варта зазірнуць у музей чыгункі — а найперш у яго аддзяленне пад адкрытым небам.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,**
*г. Баранавічы.*

Таямніцы гісторыі

# «Даспехі Радзівілаўскага Нясвіжа»

**На працягу некалькіх стагоддзяў у Нясвіжскім палацы захоўвалася найбагацейшая калекцыя зброі і даспехаў роду Радзівілаў. У цяперашні час прадметы з гэтай калекцыі прадстаўленыя ў такіх буйных сусветных музеях, як Метраполітэн (ЗША), Музей Арміі ў Парыжы (Францыя), Мастацка-гістарычны музей Вены (Аўстрыя), Брытанскі музей, музей Фіцвільяма Кембрыджскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія) і г. д. Дзякуючы ўнікальнай спробе сабраць асобныя элементы гэтых калекцый разам у палацы адкрылася выстаўка «Даспехі Радзівілаўскага Нясвіжа».**

У межах гэтага выставачнага праекта ў сценах Нясвіжскага палаца будуць паказаныя артэфакты з калекцый музея Фіцвільяма Кембрыджскага ўніверсітэта (Кембрыдж, Вялікабрытанія), Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі і Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». Сярод іх арыгінальныя баявыя паўдаспехі XVI стагоддзя, элементы баявых і парадных даспехаў, ахоўныя элементы даспехаў для коней. Асаблівае месца ў экспазіцыі займаюць артэфакты са збору музея Фіцвільяма Кембрыджскага ўніверсітэта. Тут прадстаўленыя элементы даспехаў, якія імітуюць грамадзянскі гарнітур таго часу, так званыя дуты са складкамі. Такія даспехі былі выключна параднымі або турнірнымі, іх не надзявалі ў бой. Як правіла, яны былі багата ўпрыгожаны гравіроўкай, тручэннем, пазалотай. Акрамя таго, для некаторых элементаў у экспазіцыі вядома нават імя майстра, які іх вырабіў, — гэта знакаміты нямецкі даспешнік Кольман Хельмшміт, які выконваў заказы для каралеўскіх дамоў і найбуйнейшых магнатаў Еўропы. Менавіта ён быў аўтарам вядомага даспеха Юрыя Радзівіла, «Літоўскага Геркулеса», які цяпер экспануецца ў музеі Метраполітэн (ЗША). Выстаўка знаходзіцца ў Залатой зале палацавага ансамбля і будзе адкрытая для ўсіх ахвотных да 2021 года. Яе наведванне бясплатнае (пры ўмове набыцця білета ў асноўную экспазіцыю).

Фота nlasvizh.by.

**Захар КУЗЬМІЧ.**

Пантэон Айчыны

# Сымон Будны

*(каля 1530 — 13.01.1593 гг.)*

**Сымон Будны быў бунтаром духу, які рваўся з кайданоў схаластыкі і рэлігійных догмаў. Ён прагнуў пазнання чалавека, Бога і Сусвету. І як мудрэц, ён не засмучаўся ад таго, што яго мала разумеюць. «Выбар зроблены, але я ўсё ж упэўнены, што працу маю лепш ацэняць нашчадкі», — быў перакананы ён у сваёй праваце, у каштоўнасці зробленага ім.**

Гэты мысляр «родам з Літвы» спазнаваў веды ў Кракаўскім і Кёнігсбергскім універсітэтах. Рэфармацыйны дух закрануў яго дапытлівы розум. А калі чалавек пачынае задумвацца, ён бачыць недасканаласць свету, у якім жыве, несправядлівасць яго да чалавека і жадае зрабіць яго хоць на каліўца лепшым. Будны, як шчыры пратэстант, хацеў абнаўлення рэлігійнага жыцця, вяртання да ранніх хрысціянскіх традыцый, калі паміж вернікам і Богам не стаяла царква са шматлікім сонмам сваіх служак. Для многіх з іх вера зрабілася залатой сінекурай, якая забяспечыла ім сытнае жыццё. Для Буднага — гэта сляпцы, якія вялі людзей да духоўнай прорвы. Ён стаў гарачым пашыральнікам хрыстовых запаветаў.

Па запрашэнні пратэстанскага лідара ў ВКЛ Мікалая Радзівіла Чорнага Будны ў 1558—1560 гадах выкладае тэалогію ў Віленскім зборы, пасля быў прапаведнікам у Клецкім кальвінісцкім зборы. Адначасова ён піша па-беларуску папулярны і зразумелы простаму народу выклад хрысціянскай навукі. Пры падтрымцы Радзівіла Чорнага Будны і ягоныя паплечнікі Мацей Кавячынскі і Лаўрэн Крышкоўскі заснавалі ў Нясвіжы друкарню, у якой у 1562 годзе яны і надрукавалі «Катихисис, то ест наука стародавная хрістіаньская от Светого Писма, для простых людей языка руского, въ пытаніах и отказех събрана». У гісторыі беларускай культуры гэтае выданне знамянальная з'ява! Сымон Будны аднавіў беларускае кнігадрукаванне, пачатае ў 1517 годзе Францыскам Скарынам і тым самым працягнуў ягоную асветніцкую місію. У прадмове да княжычаў Радзівілаў Будны заклікаў іх «народу язык миловати». Гэта быў заклік і да іншых высокіх «милостей» не цурацца роднай культуры, якая духоўна звязвала іх з продкамі. Тое, што не разумелі іх «милости», добра бачыў Будны — апалячванне вярхоў беларускай магнатэрыі, а за духоўным і культурным заняпадам ішоў і палітычны заняпад краіны.

Шкада, што другая беларускамоўная кніга Сымона Буднага «Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам» не дайшла да нашага часу. Яна таксама выйшла ў Нясвіжы ў 1562 годзе. Сама назва інтрыгуе і сведчыць аб смеласці думак беларускага мысляра. Нам невядомы філасофскія апраўданні Будным грэшнага чалавека перад усемагутным Богам. Але знамянальна, што мысляр абараняе чалавека, а ён і кволы, і няшчасны, і грэшны, і замест спачування і даравання часцяком атрымлівае пакаранне. Няма чаму дзівіцца, што падобная кніга не магла ацалець; яе проста знішчылі як ерэтычную і шкодную. За Будным замацавалася чорная слава ерэтыка. Асаблівы шок выклікалі ягоныя сумненні ў бязгрэшным зачацці Дзевы Марыі. Гэтае сцверджанне — не са сферы тэалогіі, а са сферы крытычнага тлумачэння самой падзеі. Яго заклікалі адумацца і пакаяцца, а ён пайшоў шляхам крытычнага пазнання свету. Будны нават далучыўся да радыкальнага крыла рэфарматараў — сацынаў, але і для іх ён быў занадта смелы ў сваіх поглядах — таксама ерэтык. І сапраўды, дапытлівы розум Буднага пранікаў у таямніцы Біблііі. Ён сумняваўся ў догме аб Тройцы, адмаўляючы Божую іпастась Святога Духа. Хрыстос для Буднага не Сын Божы, а выдатны чалавек і прапаведнік маральнай чысціні, і самым гэтым сцверджаннем мысляр узносіў чалавека да «боскасці». Ён адмаўляў звыклы погляд на душу, для яго «душа — гэта не што іншае, як чалавечае жыццё...». І пасля смерці чалавека ягоная душа не адчувае ні райскіх асалод, ні пякельных пакут — усё гэта «старечьские басьни».

Будны, як ідэаліст, марыў аб ідэальным жыцці. «Дай нам, Божа, такую ўладу, пры якой мы не думалі б пра сябе, не прыніжалі іншых, дазвалялі казаць праўду адно аднаму, не лічылі б сябе бязгрэшнымі...» Ён утапіст, калі марыць аб ідэальным уладару — богабаязным, справядлівым, міласэрным... Ён вучыў жыць па-хрысціянску іншых, а сам не змог ужыцца з людзьмі. Ён зрабіўся ізгоем. Нават яго «мілыя браты» — сацыяне, адракліся ад яго. А ягоны апякун Ян Кішка забараніў яму карыстацца друкарняй. У 1582 годзе Сымон Будны «за бязбожныя перакананні і дзеянні» быў зняты з пасады прапаведніка ў Лоскім зборы.

Будны зрабіўся грамадскім ізгоем. Любы мог яго зняважыць і пакрыўдзіць, а то і проста паздзекавацца. Гэтак п'яныя жаўнеры патрабавалі ад яго адрачыся ад сваіх перакананняў і паклясціся аб вяртанні да сапраўднай веры на дзяржанні шаблі. І нібыта ён выракся і пакляўся.

Ён быў даследчыкам. «Неабходна выпрабоўваць усё, з чым вы маеце справу. У адваротным выпадку мы не толькі не пазбавімся памылак, але яшчэ больш увязнем у іх». Вось і выпрабоўваў усё, вывучаў, аналізаваў, каб пазбавіць іншых ад памылак. Гэтае жаданне прымушала яго не толькі тлумачыць сваё разуменне Святога Пісьма, але і выпраўляць шматлікія памылкі, якія ўнеслі ў кнігу перапісчыкі. Ён узяўся перакласці Святое Пісьмо на польскую мову. Ад напружанай працы Сымон Будны страціў зрок, і тады ён узмаліўся да Бога, каб вярнуць зрок на час перакладу Біблііі. І цуд адбыўся! Ягоны пераклад выйшаў у 1572 годзе, але ад свайго аўтарства Будны адмовіўся з-за рэдактарскіх правак. Ён быў выдатным філолагам, бо ў сваім перакладзе выкарыстоўваў, паводле яго прызнання «словы велікапольскія, мазавецкія, кракаўскія, падляшскія, сандамірскія і вельмі шмат рускіх». Па сутнасці, гэта была спроба стварэння інтэрнацыянальнай мовы для ўсіх народаў Рэчы Паспалітай — своеасаблівае эсперанта.

І як дысідэнта, яго абвясцілі вар'ятам. Нібыта ён не хацеў нічога чуць і ведаць пра Бога і Хрыста. Калі перад смерцю яго прасілі звярнуцца да Бога, дык Будны нібыта адказаў: «Клянуся, я не ведаю ніякага Бога і ніякага Хрыста». Ягоная магіла ў Вішневе, дзе ён памёр у доме свайго сябра пана Льва Малкона, з часам згубілася. І каб не ягоныя пісьмовыя творы, дык забылася б і само імя. Але жыў ён не дзеля асабістай славы, а дзеля пошуку ісціны, якую так і не знайшоў. Але не быў расчараваны, бо ісціна не ў ісціне... «Шчыра скажу: мне досыць і таго, што не закапаў свайго малога таленту, а прынёс карысць», — лічыў Сымон Будны.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

Сваімі словамі

# Чыстае захапленне. Ізраілем Басавым,

## або Язэп Драздовіч і космасы, якія толькі пачынаюцца

**Падаецца, мы вельмі моцна прызвычаіліся параўноўваць сябе з некім іншым. Замежным, быццам бы лепшым. Аднак лепшыя яны ці не, пытанне спрэчнае. Як мінімум, адрозніваецца каларыт, таму ўсе папросту розныя. Беларуская Швейцарыя, беларускія Альпы, беларускія мастакі парыжскай школы. Можа быць, такая адсылка сапраўды дае некаторую агульную інфармацыю пра тое, што маецца на ўвазе. Аднак губляецца вельмі шмат нюансаў. А ў іх уся соль.**

Учора, між іншым, быў дзень нараджэння аднаго з цэнтральных беларускіх мастакоў — Язэпа Драздовіча (130 гадоў). І вось я вельмі хацела напісаць, што хоць яго ні з кім не параўноўваюць, што ён адзін такі непаўторны — наш Язэп Драздовіч! Але высветлілася, што з такімі высновамі я паспяшалася. Толькі знайшла пару артыкулаў пра мастака ў сеціве — і адразу ж давялося прачытаць «беларускі Чурлёніс»... Скажыце шчыра, шаноўныя чытачы, хто з вас знаёмы з творамі Чурлёніса? Безумоўна, гэтага літоўскага творцу выдатна ведаюць людзі ў мастакоўскім асяроддзі проста ў сілу сваёй агульнай абазнанасці ў гэтай сферы. Але няма сумневаў, што імя Язэпа Драздовіча ў нас вядомае нашмат больш! Дык навошта гэтыя параўнанні?

Таксама думалася, што гэта калонка будзе цалкам пра Язэпа Драздовіча. Пра тое, што Драздовіч — гэта космас. І не толькі ў тым сэнсе, што ён распрацоўваў касмічную тэматыку, лічыў сябе празорліўцам і час ад часу пісаў прыдуманыя ўрбаністычныя пейзажы з Марса і іншых планет. Ён ствараў таксама і космас нашай гісторыі. На яго карцінах фігуруюць Усяслаў Чарадзей (некалькі карцін), Францыск Скарына (некалькі карцін), Францішак Багушэвіч. Па-мастацку ён увасабляў і гербы, іншыя сімвалы даўняй эпохі. Яшчэ адзін напрамак яго творчасці — маляваныя дываны, — такі кірунак мастацтва прынята называць наіўным. Такое яно — гранічна шчырае, калярова-спрошчанае, але ад таго не менш каштоўнае. Пагадзіцеся, вельмі цікавае суседства тэм: космас, наіўнасць, гісторыя... Тут ёсць над чым паразважаць.

Падаецца, пры ўсёй велічы творчай асобы Язэп Драздовіч яшчэ не да канца намі засвоены, усвядомлены, палюблены. Але відавочна, што працэс у гэтым кірунку распачаты. Напрыклад, па нядзелях у кастрычніку (і першую нядзелю лістапада) у Нацыянальным мастацкім музеі а 16-й гадзіне будуць ладзіцца розныя лекцыі пра Язэпа Драздовіча. І штосьці мне падказвае, што ахвотных іх паслухаць прыйдзе даволі шмат. Бо час настаў зірнуць нам на саміх сябе. І палюбіць.

На жаль, тыя, хто прыйдзе на Язэпа Драздовіча, ужо не пабачаць карцін Ізраіля Басава, якія віселі на іншым паверсе. З апошнім днём верасня выстаўка скончыла сваю работу — а было б вельмі добра яе працягнуць!

Вось што можна прачытаць пра гэтага мастака, яшчэ менш вядомага нам, у часопісе «pARTisan» за 2014 год: *«Персанальная выстава беларускага мастака Ізраіля Басава адбылася ўжо пасля ягонай смерці. Творца, якога сёння называюць «другім Шагалам», «з'явай савецкага і постсавецкага мастацтва Беларусі», «звычайным геніем», на працягу 40 гадоў у савецкі перыяд не атрымліваў афіцыйнага прызнання. Двойчы ён звяртаўся ў Міністэрства культуры СССР з просьбай дазволіць яму паказаць людзям свае карціны.*

*У другім лісце, у 1987 годзе, за некалькі гадоў да сваёй смерці, мастак пісаў: «Я стары і за ўсё сваё жыццё ні разу не ўдзельнічаў ва ўсесаюзных выставах. Я лічу гэта несправядлівым і прашу вашага садзеяння для паказу ў Маскве хоць бы адной ці больш карцін...»*

У тым жа часопісе давялося прачытаць яшчэ шмат нечаканых і крыўдных да слёз фактаў. Проста пералічу іх. Тагачаснае мастакоўскае асяроддзе не дазваляла Ізраілю Басаву выстаўляцца нідзе. Але аднойчы яны згадзіліся, каб ён зладзіў асабістую выстаўку. Закрытую, без прэсы і гледачоў! Гэта значыць, яны самі хацелі пабачыць яго карціны, але імкнуліся не дапусціць, каб іх убачылі іншыя! Неяк у Саюз мастакоў БССР прыйшоў ліст з Вільні — там хацелі арганізаваць выстаўку Басава (дзесьці ўсё-такі ўбачылі адну карціну). Але ліст папросту выкінулі, мастаку нічога не сказалі (гэта гісторыя стала вядомая значна пазней). Кажуць, што калі б Басаў жыў у той час у Маскве, то карціны яго маштабу там бы паказалі і пра іх нарэшце стала б вядома публіцы.

Я пра Ізраіля Басава даведалася з сеціва. То тыя, то гэтыя сябры ў сваіх стужках публікавалі некалькі карцін з выстаўкі і... заўсёды захопленыя водгукі! Пагадзіцеся, сарафаннае радыё ніколі не хлусіць. Тым больш размова не пра пэўны новы фільм, а пра выяўленчае мастацтва.

Асабіста я пазаўчора ўвечары забегла ў музей за сорак хвілін да закрыцця — хацела зірнуць на Драздовіча, перад тым як пісаць (яго выстаўляюць на другім паверсе). А Ізраіля Басава выстаўлялі на першым, я зайшла туды таксама. Ведаеце што, Басаў мяне проста скарыў. Пабыўшы побач з яго карцінамі ўсяго дзесяць хвілін, я адчула, што вось яно, сапраўднае мастацтва, — і ад яго я атрымліваю асалоду. У карцін неверагодная яркая, але пяшчотная колеравая гама. І ад саміх палоцен сыходзіць... пяшчота, любоў, дух творчасці, лёгкасць — так проста і не акрэсліць. На жаль, гэта быў апошні дзень, а дакладней вечар, работы выстаўкі.

Таму, рэзюмуючы, хочацца зрабіць дзве высновы. Па-першае, выбраць якуюнебудзь нядзелю і пасля абеду завітаць на лекцыю пра Язэпа Драздовіча варта. Па-другое, тыя, хто мае такія паўнамоцтвы, працягніце работу выстаўкі Ізраіля Басава. Калі ласка. Бо мы хочам нарэшце пазнаёміцца з самімі сабой такімі, якіх не ведалі раней.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «МАПИД» (ОАО «МАПИД»)

1. Полное и сокращенное наименование эмитента

Полное наименование:

• на русском языке – Открытое акционерное общество «МАПИД»;

• на белорусском языке – Адкрытае акцыянернае таварыства «МАПІД».

Сокращенное наименование:

• на русском языке – ОАО «МАПИД»;

• на белорусском языке – ААТ «МАПІД».

2. Открытое акционерное общество «МАПИД» (далее – Эмитент) зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 197 от 26 февраля 2001 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115.

3. Место нахождения Эмитента: Республика Беларусь, 220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, дом 205, факс/тел. 2071708, официальный сайт в глобальной компьютерной сети Интернет http://mapid.by/, электронный адрес (e-mail): mail@mapid.by.

4. Основные виды деятельности Эмитента (согласно ОКРБ 005-2011):

| Код | Наименование вида деятельности |
|---|---|
| 41200 | Общее строительство зданий |

5. Номер текущего (расчетного) банковского счета Эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при размещении жилищных облигаций путем проведении открытой продажи, наименование обслуживающего банка

| | |
|---|---|
| Получатель | ОАО «МАПИД» |
| УНП получателя | 100008115 |
| Номер счета | BY76BLBB30120100008115001005 |
| Наименование банка | Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области |
| БИК | BLBBBY2X |
| Адрес банка | г. Минск, ул. Коллекторная, 11 |
| Назначение платежа | за жилищные облигации ОАО «МАПИД» пятого выпуска |

6. Пятый выпуск жилищных облигаций зарегистрирован Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 31 июля 2018 года.

Государственный регистрационный номер выпуска 5-200-02-3426.

